Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 СНЕЖНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 250 (28360)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**На пенсію па новых правілах**

СТАР. 4



**Нашы дзяўчаты вакол свету**

СТАР. 7



**Як юбілеі класікаў святкаваць будзем**

СТАР. 8-9

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:**

*«Вельмі важнае пытанне — гэта звароты грамадзян. Яму трэба надаваць самую сур'ёзную ўвагу. Гэта ненармальна, калі людзі звяртаюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта, а потым гэтыя пытанні адпраўляюцца для разгляду тым, на каго па сутнасці справы і была скарга. Вядома, трэба дэталёва і больш глыбока аналізаваць звароты грамадзян, якія паступаюць у Адміністрацыю. Значыць, ёсць нейкія недапрацоўкі на месцах, якія трэба было б аператыўна вырашаць у рэгіёнах, у тым ці іншым міністэрстве і ведамстве».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9434 | ▼ |
| Еўра | 2,0378 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0736 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# З САДУ — У САДОК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Муж і жонка Мікалай і Юлія НІЧЫПАР з вёскі Гарадзец Ушацкага раёна сёлета атрымалі добры ўраджай яблыкаў. Цяпер яны ахвотна дзеляцца сакавітай садавінай з дзіцячым садком, які знаходзіцца ў суседняй вёсцы Ільюшына.

# ВОЗЬМЕМ ВАШ БОЛЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Учора беларусы дзялілі з расіянамі жалобу па загінулых у авіякатастрофе над Чорным морам. Па даручэнні Прэзідэнта нашай краіны былі прыспушчаны сцягі на дзяржаўных установах, паўсюль увечары не гарэла святочная ілюмінацыя, была абмежаваная трансляцыя забаўляльных тэлепраграм. А да Пасольства Расіі ў Мінску цэлы дзень людзі неслі кветкі і лампадкі, арганізацыі паадмаўляліся ў гэты дзень ад правядзення навагодніх карпаратываў. Бо нельга весяліцца, калі плача той, хто побач. Нельга не спачуваць, калі блізкім людзям балюча. Нездарма ж кажуць, што сябар пазнаецца ў бядзе. Менавіта тады, калі здараецца такое вось — нечаканае, страшнае, непапраўнае, адыходзяць на другі план усе дробныя крыўды і непаразуменні. Застаецца толькі людское гора і здольнасць або няздольнасць яму спачуваць. Гэткі просты, але самы правільны экзамен на чалавечнасць.**

СТАР. 2

■ Год навукі

# КЕКС «ШАХЦЁРСКІ»,

## або «Карысны» хлеб для здароўя

**Набываючы ў краме прадукты, далёка не кожны ведае, што многія з іх можна без перабольшання назваць навуковымі распрацоўкамі. Сярод інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук важнае месца адводзіцца ўстановам, якія займаюцца праблемамі здаровага харчавання. Іх прадукцыя адрозніваецца ад іншай тым, што ўсе вырабы праходзяць спецыяльныя даследаванні, падчас якіх пацвярджаецца іх станоўчы ўплыў на арганізм.**

Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні Алены МАРГУНОВАЙ**, вектар развіцця харчовай прамысловасці ў Беларусі ўсё больш адхіляецца ад прынцыпаў здаровага харчавання. Таму цяпер наспела неабходнасць фарміравання такіх умоў, калі камерцыйная эфектыўнасць прадпрыемстваў будзе залежаць ад вытворчасці прадукцыі высокай якасці.

— Супрацоўнікі нашага навукова-практычнага цэнтра распрацавалі больш за 200 відаў кансерваў для дзіцячага харчавання на плодаагароднінай аснове, — адзначыла Алена Маргунова. — На фабрыцы «Спартак» арганізавана вытворчасць кандытарскіх вырабаў з вітамінамі і мінераламі для дашкольнікаў і школьнікаў. Распрацаваны маянэз «Школьны» для харчавання падлеткаў, ласункі для дзяцей, хворых на цэліякію і фенілкетанурыю.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА

Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,

5 разоў на тыдзень!

Вы яшчэ паспяваеце выпісаць «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ВОЗЬМЕМ ВАШ БОЛЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар)*

Пра тое, што нельга заставацца ўбаку ад трагічных падзей у Расіі, гаварыў учора ў Мінску і наш Прэзідэнт. «Учора ў нашай Расіі здарылася вялікая трагедыя. На жаль, гэта чарада трагедый стала злым лёсам над нашым брацкім народам: вялікая колькасць людзей загінула ў Іркуцку ў сувязі з атручэннем, забіты пасол Расіі ў Турцыі і загінула шмат людзей у сувязі з крушэннем ваеннага самалёта, у якім знаходзіліся 92 чалавекі. Загінулі не толькі члены экіпажа, але і вядомыя артысты, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, ваенныя людзі, дзяржслужачыя, урач. Зразумела, мы ў гэты дзень не маглі быць убаку ад гэтых трагічных падзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Словамі салідарнасці і падтрымкі прасякнута і спачуванне, якое кіраўнік беларускай дзяржавы накіраваў Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. «Пачуццё смутку і спагады ахапіла сёння нашу краіну — паведамленне аб крушэнні самалёта Ту-154, які ляцеў з Сочы ў Сірыю, не пакінула абыякавым ніводнага беларуса. Гэта трагедыя — наш агульны боль, і Беларусь сёння смуткуе разам з Расіяй. У гэту цяжкую хвіліну мы побач, поўнасцю падзяляем гэта страшнае гора», — гаворыцца ў спачуванні. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што вялікую страту панесла і сусветная культура — сярод загінулых члены калектыву праслаўленага Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай арміі імя А.В. Аляксандрава, у тым ліку і яго мастацкі кіраўнік Валерый Халілаў. «Гэта незаменная страта для расійскага, нашага агульнага, усяго сусветнага мастацтва», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў глыбокія спачуванні ўсяму расійскаму народу, родным і блізкім загінулых.

«Мы смуткуем разам з сем'ямі артыстаў ансамбля імя Аляксандрава. У Беларусі завяршаецца Год культуры, і гэту страту мы ўспрымаем, як сваю. Гэты ансамбль — набытак не толькі Расіі, але жамчужына сусветнага мастацтва, — сказала прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант. — і, вядома, мы спачуваем сем'ям загінулых журналістаў. Наш час, на жаль, такі, што сёння гэтая прафесія, напэўна, становіцца адной з самых небяспечных. Людзі выконвалі свой прафесійны абавязак. І іх сыход — вялікае ўзрушэнне і для салідарнай беларускай грамады журналістаў і для ўсёй нашай краіны ў цэлым». А яе расійскі калега Дзмітрый Пяскоў агучыў пазіцыю Крамля: «Мы вельмі цэнім той факт, што Беларусь сёння смуткуе разам з расіянамі. Гэта вельмі важна і лішні раз сведчыць аб узроўні нашых адносін, нашага саюза».

Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў выказаў спачуванні міністру абароны Расійскай Федэрацыі генералу арміі Сяргею Шайгу. А ў кнізе спачуванняў, адкрытай у пасольстве Расіі ў Мінску, пакінулі свае запісы прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, міністр замежных спраў Уладзімір Макей, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч, міністр культуры Барыс Святлоў, міністр адукацыі Ігар Карпенка. Цэлы дзень да пасольства ішлі прадстаўнікі прадпрыемстваў, грамадскіх арганізацый, проста неабыякавыя людзі.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прадбачачы, што людзей будзе шмат, на нарадзе даў даручэнне праваахоўным органам забяспечыць парадак каля пасольства. Пытанне бяспекі ў кантэксце таго, што адбываецца ў суседняй краіне, ды яшчэ перад навагоднімі святамі, увогуле застаецца адным з самых актуальных. «Падзеі ў Расіі, што адбыліся апошнім часам, — дадайце сюды яшчэ розныя ўзрывы балонаў у метро ў Маскве, трагедыі на дарогах і іншае, — сведчаць аб тым, што нам ні ў якім разе нельга расслабляцца. Мы не знаходзімся недзе ўбаку ад шляху гэтых страшных здарэнняў. Наадварот, мы знаходзімся ў самым эпіцэнтры. Таму чаго б нам ні каштавала, трэба захаваць мір і спакой у нашай краіне. Гэта — галоўнае», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Калі гэтага не будзе, ніякая эканоміка будзе не патрэбна, ніякія прадукты харчавання, ніякае фінансаванне, ні знешняе, ні ўнутранае. Галоўнае пытанне — гэта пытанне бяспекі і стабільнасці нашага грамадства», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён запатрабаваў звярнуць на адпаведныя пытанні пільную ўвагу, пачынаючы ад мясцовых органаў улады, кіраўнікоў сельскіх, пасялковых саветаў, заканчваючы ўрадам, Дзяржсакратарыятам Савета бяспекі, КДК, Адміністрацыяй Прэзідэнта, паведамляе БЕЛТА. «Я прашу гэта мець на ўвазе перш за ўсё, асабліва напярэдадні масавых мерапрыемстваў, звязаных са светлымі і радаснымі для кожнага чалавека святамі — Новым годам і Калядамі, — адзначыў Прэзідэнт. — Страшная катастрофа ў квадраце, калі людзі гінуць, чакаючы гэтых урачыстасцяў, свят. Гэта недапушчальна». «Асабліва людзям у пагонах трэба зрабіць усё, каб на вуліцах было спакойна, каб людзі правялі нармальна свята», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

# У АДПАВЕДНАСЦІ З ДЗЯРЖАЎНЫМІ ІНТАРЭСАМІ

## Прэзідэнт — пра ўмовы прыцягнення інвестыцый у нашу краіну

**Аляксандр Лукашэнка ўчора правёў нараду па пытаннях знешняга фінансавання.**

«Нам неабходна абмеркаваць пытанне прыцягнення знешніх фінансавых сродкаў для інвестыцый у нашу эканоміку. У першую чаргу рэсурсы патрэбныя рэальнаму сектару. Пытанне не ў тым, дзе іх знайсці і як. Размова пойдзе аб канкрэтных крэдытах, якія нам прапануюць. Не толькі мы просім у кагосьці (гэта нармальная практыка), а нам прапаноўваюць сёння нашы партнёры. Перш за ўсё расійскія банкі. Нам трэба абмеркаваць правілы запазычанняў, кошт гэтых крэдытаў, варта ці не варта іх браць, куды накіраваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адным з найважнейшых каналаў паступлення крэдытаў з'яўляецца банкаўская сфера. На нарадзе было адзначана, што за апошнія гады ў Беларусі склаліся дзелавыя партнёрскія адносіны з шэрагам замежных банкаў, якія працуюць у краіне. «Проста трэба варушыцца, грошай у свеце дастаткова. Вядома, ніхто раскідвацца імі не будзе. Але наша краіна мае добрую крэдытную гісторыю, мы нікому ніколі не былі павінны і не плануем мець пратэрмінаваныя крэдытныя рэсурсы або даўгі, таму трэба выкарыстаць гэта і працаваць. Працаваць і з заходнімі банкамі, і з нашымі філіяламі расійскіх банкаў, — паставіў задачу Прэзідэнт. — Але пры запазычанні трэба мець на ўвазе, што эканамічная бяспека і ўзровень золатавалютных рэзерваў — гэта святое. З гэтых падыходаў трэба зыходзіць пры вызначэнні мэтазгоднасці прыцягнення знешніх сродкаў».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нейкай гонкі за іх аб'ёмамі быць не павінна, каб не залезці ў неаплатныя пазыкі. «Умовы прыцягнення фінансаў павінны адпавядаць выключна дзяржаўным інтарэсам, мець ясныя перспектывы і мэты, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Калі ёсць канкрэтныя праекты, разлікі іх акупнасці, і яны прымальныя, трэба вырашаць пытанне аб знешніх запазычаннях пад гарантыі нашага ўрада».

На нарадзе, як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, былі абмеркаваныя некаторыя вынікі працы эканомікі ў 2016 годзе, у тым ліку такія пытанні, як стан рэзерваў, інвестыцыйнага клімату, прывабнасць для прыходу інвестараў, выкананне праграмы з Еўразійскім фондам стабілізацыі і развіцця.

■ Акцэнты тыдня



# ГОД ЗАКАНЧВАЕЦЦА НЕСПАКОЙНА

Свет узрушыла **трагедыя з крушэннем расійскага самалёта** Ту-154 над Чорным морам, у якім знаходзіліся артысты ансамбля песні і танца імя Аляксандрава на чале з кіраўніком Валерыем Халілавым, журналісты трох федэральных тэлеканалаў і выдатны гуманітарны дзеяч — доктар Лізавета Глінка. Пакуль яшчэ незразумела, што стала прычынай. На карысць тэракта гаворыць імгненнае знікненне самалёта з радараў і вялікі радыус роскіду абломкаў, хоць, паводле папярэдніх заяў, гэта не з'яўляецца асноўнай версіяй. Магчымыя і іншыя прычыны — тэхнічныя праблемы або фактар памылкі пілота. Далучаючыся да спачуванняў, неабходна і задаць пытанне: ці так ужо было неабходна саджаць ядро аднаго з самых выдатных творчых калектываў свету ў адзін самалёт, выпушчаны яшчэ ў 1983 годзе? Тым больш што ляцеў самалёт у Сірыю, якая ваюе, а гэта рабіла яго відавочнай мішэнню для тэрарыстаў усіх масцяў. Другое пытанне ўзнікае ў дачыненні да тых, хто ў сацыяльных сетках каментаваў гібель 92 чалавек. Асабліва ўзрушвае пазіцыя, распаўсюджаная ў англамоўных сетках, — маўляў, артыстаў шкада, але, з іншага боку, ляцелі яны ў Сірыю, дзе Расія знішчае грамадзянскае насельніцтва, каб праслаўляць расійскую зброю, таму па заслугах ім. Пры гэтым так пішуць людзі, якія лічаць сябе лібераламі і ні разу ў жыцці не былі ў Сірыі, але, безумоўна, вераць у тое, што вызваленне Алепа сірыйскімі і расійскімі войскамі — гэта акт генацыду, а цалкам падобная сітуацыя ў Масуле, дзе дзейнічаюць іракская армія і амерыканскія войскі, — гэта важны крок у барацьбе з тэрарыстамі. Падобныя двайныя стандарты мыслення ўсё больш аддаляюць Захад ад незаходніх краін, у якіх захавана здольнасць цвяроза аналізаваць сітуацыю ў свеце.



**Рэдкі выпадак тэрарызму** здарыўся на тыдні. Два чалавекі, пагражаючы зброяй, захапілі авіялайнер лівійскай кампаніі, які ажыццяўляў палёт па ўнутраным маршруце, і прымусілі экіпаж ляцець у Рым. Паколькі паліва не хапіла, самалёт сеў на Мальце. Пасля доўгіх перамоў тэрарысты вызвалілі заложнікаў і здаліся самі. У экіпажа і пасажыраў не было сумнення, што зброя з'яўляецца сапраўднай, паколькі Лівія ахоплена хаосам грамадзянскай вайны. Але яна, на здзіўленне ўсім, аказалася муляжамі. Захопы самалётаў сталі амаль нормай у 1970—1980-х гадах, калі ў свеце хапала дзяржаў, у якія можна было ўгнаць самалёт і беспакарана яго пакінуць, забіўшы ўсіх або пэўную колькасць пасажыраў. Сёння сітуацыя з краінамі, гатовымі адкрыта падтрымаць тэрарыстаў, радыкальна змянілася. Цяпер угон самалёта гарантавана вядзе да гібелі тэрарыстаў або доўгіх турэмных тэрмінаў. Захопнікаў лівійскага самалёта, дарэчы, можа чакаць пажыццёвае зняволенне.

**Ізраіль быў узрушаны рэзалюцыяй, прынятай Саветам Бяспекі ААН** 23 снежня. Праект рэзалюцыі быў спачатку прадстаўлены Егіптам, але ў далейшым ён зняў яго з галасавання. Гэтым разам праект вылучылі Новая Зеландыя, Сенегал, Венесуэла і Малайзія. Сутнасць рэзалюцыі 2334 заключаецца ў тым, што пасяленні на акупаваных землях Палесціны «не маюць юрыдычнай сілы і з'яўляюцца грубым парушэннем міжнароднага права». Прыняць рэзалюцыю было б немагчыма, калі б ЗША не ўстрымаліся ад галасавання, як яны і зрабілі, а наклалі б вета. У выніку 14 краін прагаласавала «за», а пазіцыя ЗША дазволіла прыняць рэзалюцыю. Праблема ў тым, што Ізраіль з'яўляецца найважнейшым саюзнікам ЗША ў рэгіёне, і спроба прыняць падобную рэзалюцыю пяць гадоў таму была спынена менавіта ЗША. Ізраіль ужо выклікаў да сябе паслоў краін — членаў Савета Бяспекі ААН і адклікаў сваіх паслоў з Новай Зеландыі і Сенегала для кансультацый. Сітуацыя з амерыканскай пазіцыяй па гэтым пытанні рэзка зменіцца пасля прыходу да ўлады Дональда Трампа, які ўжо абяцаў Ізраілю ўсялякую падтрымку. Ён ужо асудзіў і прынятую рэзалюцыю.

З'явіліся сур'ёзныя **перспектывы паляпшэння расійска-малдаўскіх адносін**. 23 снежня прайшла інаўгурацыя новага прэзідэнта Малдовы Ігара Дадона, а ўжо 24 снежня адбыліся яго перамовы з расійскім віцэ-прэм'ерам Дзмітрыем Рагозіным. Прэзідэнт Малдовы прыняў запрашэнне Уладзіміра Пуціна ажыццявіць візіт у Маскву 17 студзеня для абмеркавання двух самых важных для краіны пытанняў — вяртання малдаўскай прадукцыі на рынак Расіі і амністыі грамадзян Малдовы, якія парушылі рэжым знаходжання падчас работы ў Расіі і не могуць цяпер у ёй працаваць. Абедзве меры ажыццяўляюцца ў Расіі ў кантэксце папярэдняга цеснага збліжэння Кішынёва з Еўрапейскім саюзам, які ўключае асацыяцыю з ЕС і стварэнне зоны свабоднага гандлю. Малдаўская эканоміка сур'ёзна пакутуе ад прынятых Расіяй мер, паколькі ў зоне свабоднага гандлю з Еўрасаюзам на самай справе шмат абмежаванняў на экспарт сельскагаспадарчых тавараў, якія ў выніку прадаць у ЕС у неабходных аб'ёмах немагчыма, а вызваны расійскі рынак стаў для многіх тавараў недаступны.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Парламенцкі дзённік

# Неабходны саюз, а не палітычны праект

**Сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ўчора адкрылася ў Маскве і пачалася з хвіліны маўчання ў памяць пра ахвяр катастрофы самалёта Ту-154.**

Нашу дэлегацыю ўзначаліў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. Да пачатку работы сесіі ён сустрэўся са сваім калегам Вячаславам Валодзіным, старшынёй Дзярждумы Федэральнага сходу Расіі. Як паведаміла прэс-служба Палаты прадстаўнікоў, спікеры абмеркавалі арганізацыйныя пытанні 51-й сесіі саюзнага парламента, узгаднілі пазіцыі па найбольш важных пытаннях парадку дня.

Учора адбылася працэдура прызнання паўнамоцтваў дэпутатаў Парламенцкага сходу, дэлегаваных Нацыянальным сходам Беларусі і Федэральным сходам Расіі пасля парламенцкіх выбараў у абедзвюх краінах. Потым адбыліся выбары старшыні Парламенцкага сходу і яго намесніка. Уладзімір Андрэйчанка абраны першым намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Вячаслаў Валодзін — старшынёй.

Выступаючы перад парламентарыямі, спікер нашай Палаты прадстаўнікоў заявіў, што Беларусь і Расія павінны ўзмацніць узаемадзеянне ва ўсіх сферах. «У адносінах Беларусі і Расіі не ўсё дабратворна, рэгулярна прымаюцца пратэкцыянісцкія рашэнні, якія супярэчаць заканадаўчай базе Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза, — заявіў Уладзімір Андрэйчанка. — У ЕАЭС не прымаецца важных рашэнняў, а сам саюз ператвараецца ў палітычны праект».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## АГУЛЬНАЕ ГОРА

З ранку ў панядзелак дзясяткі брастаўчан прыходзяць да будынка генеральнага консульства РФ у Брэсце па вуліцы Пушкінскай. У кнізе спачуванняў ужо пакінулі шмат запісаў.

У першай палове дня консульства наведалі старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Сяргей Ашмянцаў, намеснік старшыні аблвыканкама Алег Вялічка, старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук. Кожны з іх напісаў словы смутку і падтрымкі родным і блізкім загінулых у авіякатастрофе, а таксама словы салідарнасці з народам Расіі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Даслоўна

# ПА СІЛАХ ВЫЙСЦІ Ў ЛІДАРЫ

## Упэўнены старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра

**Сёлета, нягледзячы на пэўныя складанасці, Мінская вобласць дынамічна развівалася, ва ўсіх сферах ёсць добрыя вынікі. Гэтай прыемнай навіной з журналістамі рэгіянальных і рэспубліканскіх выданняў падзяліўся на выязной прэс-канферэнцыі ў горадзе Узда старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА.**

— Штогод матэрыяльна ўмацоўваюцца сацыяльная сфера, медыцына, культура, — адзначыў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна. — Толькі сёлета купілі два апараты магнітна-рэзананснай тамаграфіі коштам каля 40 млрд недэнамінаваных рублёў. Налета плануецца набыць такія апараты і ангіёграфы для Слуцкай і Маладзечанскай цэнтральных раённых бальніц. Наогул, за апошнія тры гады ў ахову здароўя ўкладзена 714 млрд рублёў ( у цэнах да дэнамінацыі). Практычна ва ўсіх школах і дзіцячых садах, а іх у вобласці адпаведна 500 і 600, адбыўся або працягваецца рамонт, у тым ліку і гаспадарчым спосабам.

### Падставы для аптымізму

У прамысловасці таксама атрымалася стабілізаваць сітуацыю. Сёлета галіна выйдзе па тэмпах вытворчасці прадукцыі на ўзровень 102%.

— Падзенне паказчыкаў удалося спыніць і пачынаецца іх рост. Сёлета значныя змены адзначаюцца на галоўных інвестыцыйных пляцоўках. Практычна завяршаецца будаўніцтва першага ў Беларусі завода па вытворчасці легкавых аўтамабіляў — сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «БелДжы», — падкрэсліў Сямён Шапіра. — У будучым годзе на першым этапе прадпрыемства будзе выпускаць 60 тыс. легкавікоў у год.

Сямён Шапіра станоўча ацаніў работу Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Важнейшым для вобласці праектам ён назваў стварэнне нацыянальнай біятэхнічнай карпарацыі, якая выступіць заказчыкам па праектаванні і будаўніцтве высокатэхналагічных прадпрыемстваў па вытворчасці кармоў і кармавых дабавак для жывёлы. Інвестар гатовы ўкласці ў гэты праект больш як 200 млн долараў. Інвестарам праекта па ўзвядзенні Нежынскага горна-ўзбагачальнага камбіната ў Любанскім раёне выступае «Слаўкалій». Цяпер тут актыўна вядуцца работы.

Па тэмпах росту валавога рэгіянальнага прадукту Міншчына на другім месцы ў краіне. На думку старшыні Мінаблвыканкама, у цэнтральнага рэгіёна ёсць усе падставы выйсці па выніках года на лідарскія пазіцыі, паколькі ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Беларуськалій» назіраецца рост вытворчасці.

Як адзначыў Сямён Шапіра, ні ў адной сферы няма застою. Добрыя вынікі паказвае фармацэўтыка. Лекавыя прэпараты, якія выпускаюцца ў Барысаве, Лагойску, Нясвіжы, запатрабаваны за мяжой.

### Зямля гаспадара любіць

Асобна спыніўся кіраўнік Мінскай вобласці на інвестарах, якім, згодна з Указам Прэзідэнта №138, у 2004 годзе былі перададзены нерэнтабельныя сельгасарганізацыі. Усе заняпалыя гаспадаркі былі прададзены, як кажуць, з малатка, літаральна за капейкі. На жаль, каля 20% з іх новыя ўласнікі давялі, мякка кажучы, да ручкі.

Разам з тым, астатнія прадпрыемствы працуюць. Хтосьці лепш, нехта горш. Шмат перамен адбылося, напрыклад, у сельгасарганізацыі, якую набыло ў вёсцы Цеплень Уздзенскага раёна сумеснае прадпрыемства «Беліта-Вітэкс»: пабудаваны сучасныя фермы, сховішча для садавіны і гародніны, наладжана вытворчасць.

У Мінскай вобласці выяўлена 15 тыс. гектараў зямель, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца. Іх прапанавалі ўзяць фермерам. Але тыя не спяшаюцца ўгоддзі асвойваць. «Гэтая справа матэрыяльна затратная, а на сённяшні дзень не ва ўсіх дастаткова грошай», — лічыць старшыня аблвыканкама.

З другога боку, забюракратызавана сістэма афармлення. Кіраўнік дзяржавы даручыў распрацаваць праграму паскоранага выдзялення. Але аблвыканкам не можа ўзяць на сябе такія функцыі, паколькі гэта прэрагатыва ўрада. «Я думаю, магчыма, трэба фермерам , якія згодны ўзяць участкі, аказваць і матэрыяльную дапамогу», — адзначыў Сямён Шапіра.

### Урок «Даніэлы»

Што датычыцца ўрагана «Даніэла», то ён стаў добрым урокам для службаў і падраздзяленняў Міншчыны, мясцовых уладаў.

Стыхія больш за ўсіх закранула Смалявіцкі, Крупскі, Бярэзінскі раёны. Але не прынесла вялікіх непрыемнасцяў мясцовым. Шкода нанесена лясному фонду: паваленыя дрэвы. Вядзецца актыўная работа па расчыстцы ўгоддзяў, драўніна сартуецца. Тое, што нельга выкарыстаць, ідзе на дровы. Старшыня Мінаблвыканкама распарадзіўся дапамагчы людзям, дамы якіх закрануў ураган. Яны атрымлівалі будаўнічыя матэрыялы, шыфер з цэментных заводаў, акрамя таго, былі задзейнічаны рэзервы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Матэрыялы з магазінаў адпускалі без папярэдняй аплаты. У прыватнасці, частку сродкаў пацярпелыя атрымалі з абласнога бюджэту, каля 15—20% аплаціў «Дзяржстрах». 250 тыс. рублёў, якія выдзеліў дзве кітайскія фірмы, аддалі Смалявіцкаму раёну.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■

# КЕКС «ШАХЦЁРСКІ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для дыетычнага харчавання прапануюем шэраг маслатлушчавых прадуктаў з паніжаным утрыманнем халестэрыну, кандытарскія вырабы з нізкім працэнтам цукру. Упэўнена, што знойдуць свайго спажыўца і такія прадукты, як яблычныя чыпсы, смузі, зефір з прэбіётыкамі (рэчывамі, якія стымулююць жыццядзейнасць карыснай мікрафлоры кішэчніка. — **Аўт.**), напоі для спартсменаў, кактэйлі для нармалізацыі кішэчнай мікрафлоры, бульбяныя крокеты, галеты з начынкамі, прэсервы з прэснаводнай рыбы і многія іншыя карысныя прадукты.

На прадпрыемстве «Белтэхнахлеб» НАН Беларусі таксама ствараюць прадукты для здаровага харчавання. Тут выпускаюць узбагачаныя хлебабулачныя вырабы, у тым ліку для дыеты і лячэння. Распрацавана прадукцыя для хворых на цукровы дыябет — у ёй выкарыстоўваюцца новыя віды сыравіны, якія спрыяюць больш упэўненаму засваенню вугляводаў у арганізме і не прыводзяць да рэзкіх скачкоў узроўню цукру ў крыві.

— Цяпер сярод моладзі модна трымаць сябе ў форме, сядзець на дыетах, — лічыць **намеснік дырэктара гэтай установы Наталля ЛАПЦЁНАК.** — Таму мы распрацавалі тарты і пірожныя з паніжанай энергетычнай вартасцю, якія ўтрымліваюць значна менш калорый, чым аналагі, што прысутнічаюць на рынку Беларусі. У сваю чаргу, створаны і супрацьлеглыя прадукты — лінейка вырабаў «Шахцёрскія» з павышанай харчовай і біялагічнай каштоўнасцю. Яна разлічана на людзей, якія займаюцца цяжкай фізічнай працай. Ёсць распрацоўкі для людзей сталага ўзросту, напрыклад, лінейка хлябоў «Карысны», спажыванне якіх спрыяе ўмацаванню сардэчна-сасудзістай сістэмы, паляпшае фізічны стан арганізма і падаўжае актыўнае жыццё. Вельмі высокія патрабаванні ў нас да дзіцячай прадукцыі. Створаны хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, збалансаваныя па ўтрыманні бялкоў, тлушчаў і вугляводаў і ўзбагачаныя селенам, жалезам, харчовымі валокнамі, вітамінамі групы В. Даволі востра ў краіне стаіць праблема з захворваннямі на цэліякію і фенілкетанурыю — для іх вырашэння мы распрацавалі безглютэнавыя макаронныя вырабы і хлябы пад маркай «Новы».



Фота БЕЛТА.

— Ва ўмовах нашай краіны малочныя прадукты — найбольш зручныя з тэхналагічнага пункту гледжання для правядзення працэдур узбагачэння, — паведаміла **загадчык лабараторы прыкладных біятэхналогій і дзіцячага харчавання Інстытута мяса-малочнай прамысловасці НАН Наталля ЖАБАНОС.** — Сярод апошніх распрацовак нашага інстытута я б вылучыла кісламалочныя прадукты, якія ўтрымліваюць комплекс прабіятычных мікраарганізмаў і прэбіётыкаў. Гэта, напрыклад, лінейка дыетычнага лячэбнага харчавання, узбагачанага кальцыем і прэбіётыкамі, пад назвай «Біфімол». У сваіх вырабах выкарыстоўваем інулін — рэчыва, якое не толькі пазітыўна ўплывае на смак, але і спрыяе засваенню кальцыю.

Паводле слоў навукоўцы, такія прадукты прыйдуцца беларусам даспадобы ўзімку — падчас хвароб часта даводзіцца карыстацца антыбіётыкамі, якія забіваюць не толькі шкодную, але і карысную мікрафлору чалавека. Аднавіць яе дапамогуць малочнакіслыя вырабы. Зрэшты, ёсць і шэраг людзей, якія маюць індывідуальную непераноснасць лактозы — спецыяльна для іх на рынак з новага года будуць выпушчаны прадукты з нізкім утрыманнем гэтага вугляводу — не больш за 1 грам на 100 мілілітраў.

Пра інавацыі ў сферы мяснога харчавання расказала **старшы навуковы супрацоўнік аддзела тэхналогій мясных прадуктаў Інстытута мяса-малочнай прамысловасці Ірына КАЛТОВІЧ.** Паводле яе слоў, усе створаныя навукоўцамі прадукты распрацаваны з улікам рэкамендацый айчынных медыкаў і нутрыцыёлагаў. Адна з перспектыўных распрацовак — вялікая лінейка мясных кансерваў, якія выпускаюцца на Аршанскім камбінаце. Гэта, напрыклад, узбагачаныя мінераламі і вітамінамі розных груп кансервы для дзяцей дашкольнага ўзросту, раслінна-мясныя кансервы для хворых на фенілкетанурыю, кансервы для харчавання цяжарных і кормячых жанчын.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## Сродкі — на прарыў

**У 2017 годзе Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях накіруе 20 працэнтаў рэсурсаў на «прарыўныя» праекты.**

Пра гэта паведаміў старшыня ДКНТ Аляксандр Шумілін. Паводле яго слоў, адной з галоўных праблем навуковай сферы з'яўляецца забюракратызаванасць сістэмы прыняцця рашэнняў. Так, напрыклад, калі вучоны з нейкіх прычын не змог дасягнуць усіх пастаўленых у праекце мэт, ён павінен вярнуць у дзяржаўны бюджэт сродкі, затрачаныя на працу. Такім чынам, многія спецыялісты адмаўляюцца ад распрацовак з высокім узроўнем рызыкі, бо фактычна не маюць права на памылку.

— З гэтай прычыны ў наступным годзе перад намі стаіць задача 20 працэнтаў фінансавання дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм накіроўваць на так званыя «прарыўныя» праекты, дзе могуць быць незапланаваныя загадзя задачы. Як правіла, такія распрацоўкі з'яўляюцца найбольш прыбытковымі, але сёння вучоныя баяцца браць на сябе адказнасць за іх рэалізацыю. Калі гэтага ніхто і ніколі не рабіў у свеце, то гарантаваць, што гэта атрымаецца ў нас, нельга.

■ Надвор'е

# АДЛІГА НА ФОНЕ ВЕТРУ

## Аднак у другой палове тыдня крыху пахаладае, калі ўначы месцамі будзе нават да мінус 9 градусаў

**У апошні тыдзень года чакаецца цёплае, але няўстойлівае надвор'е, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



Фота БЕЛТА.

У першую палову тыдня праз нашы паўночна-ўсходнія раёны будзе рухацца цыклон з боку Балтыйскага мора. Ён прынясе ветранае і цёплае надвор'е. Ужо сёння паўсюдна пройдзе мокры снег і дождж, на асобных участках дарог галалёдзіца. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — парывамі да 22 м/с. Тэмпература паветра — 1—4 цяпла. У сераду надвор'е яшчэ мацней сапсуецца, бо на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе кароткачасовы мокры снег. У асобных раёнах прагназуецца мяцеліца, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы і раніцай на значнай частцы тэрыторыі, а ўдзень — у асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

Ужо з чацвярга на Беларусі чакаецца рост атмасфернага ціску і паляпшэнне надвор'я. Вецер сціхне, ападкаў стане менш, будзе халадней. У чацвер уначы і раніцай у асобных раёнах краіны чакаецца невялікі кароткачасовы снег.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у навагоднія святы чакаецца не зусім зімовае, але спакойнае надвор'е. У суботу і нядзелю у асобных раёнах краіны магчымы кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. На выключаючы сіноптыкі слабыя туман і галалёд, а на дарогах галалёдзіцу. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, а пры праясненнях — да 7 марозу. Праўда, удзень прагназуецца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# АЗДАРАЎЛЕННЕ З «НАДЗЕЯЙ» І ДЗЕДАМ МАРОЗАМ

**Дзеці ад 6 да 17 гадоў, якія пражываюць у забруджаных у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС раёнах краіны, штогод адналяюць сілы ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Надзея». Учора для дзетак малодшага школьнага ўзросту і дзяцей-інвалідаў у цэнтры прайшло сапраўднае тэатралізаванае навагоднее свята з ласункамі і карагодам з Дзедам Марозам і Снягуркай.**

Такое відовішчнае мерапрыемства нясе ў сабе мацнейшы эмацыянальны зарад. Стварыць такое дома проста немагчыма, адзначалі бацькі дзетак, дзякуючы арганізатарам свята. Падарунак атрымаў таксама і сам цэнтр. Плазменны тэлевізар і радыёмікрафон прывёз з сабой **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

Ён адзначыў, што каля 80% ад агульнай колькасці сродкаў, што выдзяляюцца на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне, расходуюцца менавіта на дзяцей. Штогод бясплатныя пуцёўкі атрымліваюць больш за 80 тысяч дзяцей з чарнобыльскіх рэгіёнаў.

Непасрэдна цэнтр «Надзея», які знаходзіцца ў Мінскай вобласці пад Вілейкай, на працягу 21 дня летам прымае каля 450 дзетак, а ў навучальны год — 320. У перыяд вучобы школьнікаў стараюцца накіроўваць у цэнтр цэлымі класамі разам з класным кіраўніком, каб малым было лягчэй адаптавацца і яны маглі эфектыўна аздараўляцца. А дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі праходзяць рэабілітацыю ў суправаджэнні бацькоў або валанцёраў.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

## Сацыяльны клопат

# ПЕНСІІ ПРАЦУЮЧЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ НЕ ЗМЕНЯЦЦА

**Як вядома, з 1 студзеня 2017 года прадугледжана паэтапнае штогадовае павышэнне на 6 месяцаў пенсійнага ўзросту да дасягнення мужчынамі 63 гадоў, жанчынамі — 58 гадоў. Аналагічна будзе павялічаны і ўзрост, які дае права на льготныя працоўныя пенсіі і пенсіі за выслугу гадоў. 21 снежня прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падчас анлайн-канферэнцыі на сайтах Мінпрацы і сацабароны і БЕЛТА адказалі на пытанні беларусаў, якія датычацца зменянняў у пенсійнай сістэме. «Звязда» публікуе найбольш цікавыя і актуальныя пытанні і адказы.**

**— Ці магчыма ў Беларусі далейшае павышэнне пенсійнага ўзросту ў бліжэйшыя гады?**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валерый КАВАЛЬКОЎ:**

— На бліжэйшыя шэсць гадоў рашэнне па пенсійным узросце прынята: ён будзе паступова павялічвацца, кожны год на 6 месяцаў, да 58 гадоў у жанчын і 63 гадоў у мужчын у 2022 годзе. Што датычыцца доўгатэрміновага перыяду — час пакажа. Тут важна, як будуць складвацца дэмаграфічныя працэсы, як будзе працаваць эканоміка і, адпаведна, якой будзе сітуацыя з паступленнем унёскаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Значэнне будуць мець і іншыя фактары — занятасць, міграцыя і г.д.

**— Пытанне з нагоды перадпенсійнага ўзросту. Зараз гэта 53 гады для жанчын і 58 гадоў — для мужчын. А ў 2017-м і наступных гадах?**

**Валерый Кавалькоў:**

— Па меры павышэння пенсійнага ўзросту будзе адпаведна павялічвацца і перадпенсійны ўзрост. Адзначу, што прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2016 года № 452, які прадугледжвае ўнясенне адпаведных змен у норму Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 2000 г. № 180 аб перадпенсійным узросце, у адпаведнасці з якім вызначаецца тэрмін дзеяння кантракта, што заключаецца (падаўжаецца) з работнікам.

**— Узрост выхаду на пенсію залежыць толькі ад даты нараджэння? Ці мае значэнне дата звароту па прызначэнне пенсіі?**

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацабароны Ларыса ЯШКОВА:**

— Улічваючы, што пэўнаму каляндарнаму году адпавядае свой пенсійны ўзрост, дата звароту па прызначэнне пенсіі, безумоўна, мае значэнне. Так, калі грамадзянін дасягнуў агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту ў снежні канкрэтнага года і не рэалізаваў свае пенсійныя правы да канца гэтага года, то права на пенсію ў яго паўстане толькі па ўзросце, які ўстаноўлены ў годзе яго звароту па прызначэнне пенсіі.

**— Калі ў 2017 годзе мне выходзіць на пенсію, за які перыяд трэба пацвердзіць заработную плату для яе вылічэння?**

**Ларыса Яшкова:**

— У 2017 годзе заробак для вылічэння пенсіі будзе вызначацца за апошнія 23 гады запар стажу працы, але не больш чым за фактычна існуючы стаж працы. Таму калі вы да дня прызначэння пенсіі працягнеце працаваць, то заробак будзе ўлічвацца пачынаючы з 1994 года альбо, калі былі перапынкі ў працы, — за больш ранні перыяд. За час да ўвядзення ў краіне персаніфікаванага ўліку (да 1 студзеня 2003 года) для вылічэння пенсіі заробак пацвярджаецца даведкамі працадаўцаў.

**— Ці можна выбраць для вылічэння пенсіі больш высокі заробак за ўсю працоўную дзейнасць?**

**Начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля МУРАШКЕВІЧ:**

— Не, такая магчымасць заканадаўствам не прадугледжана. Заробак для вылічэння пенсіі вызначаецца за ўстаноўлены заканадаўствам перыяд. Так, у 2016 годзе пенсія вылічваецца з заробку за апошнія 22 гады стажу працы, але не больш чым за фактычна існуючы стаж працы. Штогод названы перыяд павялічваецца на адзін год да фактычна наяўнага ў грамадзяніна стажу працы.

**— Чаму перыяды вучобы, догляду за дзецьмі перасталі ўлічваць для пенсіі?**

**Валерый Кавалькоў:**

— Такія перыяды як улічваліся, так і ўлічваюцца ў стаж і ўплываюць на памер пенсіі. Гэта рэгламентуецца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні».

Аднак для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце неабходны яшчэ і мінімальны перыяд працы з выплатай абавязковых страхавых унёскаў (страхавы стаж). У перыяды навучання, догляду за дзецьмі і іншыя перыяды грамадска карыснай дзейнасці (прадугледжаныя часткай другой артыкула 51 Закона) выплата ўнёскаў не ажыццяўляецца (не ажыццяўлялася). Таму такія перыяды не залічваюцца ў страхавы стаж.

**— Лічу, што страхавы стаж неапраўдана вялікі для тых, хто служыў у арміі, даглядаў непрацаздольных.**



Фота БЕЛТА.

**Наталля Мурашкевіч:**

— Па агульнапрынятым падыходзе ва ўмовах старэння насельніцтва права на пенсію за кошт сродкаў страхавання даецца тым, хто на працягу значнага перыяду ажыццяўляў працоўную дзейнасць з выплатай унёскаў на дзяржаўнае сацыяльнае (пенсійнае) страхаванне. Пры гэтым патрабаваная працягласць мінімальнага страхавога стажу эканамічна і сацыяльна абгрунтавана тым, што працоўная пенсія выплачваецца грамадзянам працяглы перыяд — у сярэднім больш за 20 гадоў (жанчынам — каля 26 гадоў). Прычым гэты перыяд паступова павялічваецца за кошт росту працягласці жыцця.

Так, для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце на агульных падставах у 2016 годзе патрабуецца не менш за 15 гадоў 6 месяцаў страхавога стажу. Штогод яго працягласць будзе павышацца на 6 месяцаў да 20 гадоў да 2025 года.

З іншага боку, такія патрабаванні па мінімальным страхавым стажы для работнікаў пасільныя. Бо стаж у 15—20 гадоў працы фарміруецца на працягу ўсяго працаздольнага перыяду жыцця, што дазваляе яго сфарміраваць нават з улікам магчымага адцягнення на іншую сацыяльна значную дзейнасць.

**— У перыяд з 1995 па 1999 год займалася прадпрымальніцкай дзейнасцю і добрасумленна плаціла падаткі. Паколькі прадпрымальнікі ў гэты перыяд былі вызваленыя ад выплаты ўнёскаў у пенсійны фонд, страхавыя ўнёскі я не плаціла. Цяпер мне кажуць, што гэты перыяд не будзе мне ўключаны ў пенсію. Гэта насамрэч так?**

**Валерый Кавалькоў:**

— Згодна з артыкулам 51 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» перыяд ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ўключаецца ў стаж для мэт пенсійнага забеспячэння пры ўмове выплаты абавязковых страхавых унёскаў. У перыяд да 1 жніўня 2002 года для індывідуальных прадпрымальнікаў заканадаўствам быў устаноўлены добраахвотны парадак выплаты абавязковых страхавых унёскаў (а не вызваленне ад іх выплаты): г.зн. прадпрымальнік сам вырашаў, плаціць яму страхавыя ўнёскі альбо не, і тым самым фарміраваць пенсійныя правы, ці не.

Падстаў для ўключэння ў стаж перыядаў прадпрымальніцкай дзейнасці без выплаты страхавых унёскаў не маецца.

**— Ці не прывядзе павышэнне пенсійнага ўзросту да росту напружанасці на рынку працы? Як вядома, вакансій з прымальным узроўнем аплаты працы ў рэгіёнах краіны не так і шмат, а тут яшчэ тысячы работнікаў, што не выйдуць на пенсію ў свае 55/60 гадоў і працягнуць працаваць...**

**Валерый Кавалькоў:**

— Рашэнне аб павышэнні пенсійнага ўзросту — з улікам таго, што яно павінна быць паступовым, па 6 месяцаў у год — якраз прынята з улікам ёмістасці рынку працы.

Пры гэтым трэба ўлічваць, што ўжо сёння занятасць сярод «новых» пенсіянераў досыць высокая. У першы год пасля прызначэння пенсіі працягваюць працаваць каля 70% жанчын і больш за палову мужчын. Пры павышэнні пенсійнага ўзросту група такіх работнікаў, якія і не мелі намеру пакінуць рынак працы, будзе, як і сёння, працягваць працаваць.

Да таго ж у нас створаны і будуць стварацца новыя працоўныя месцы, як гэта прадугледжана Указам кіраўніка дзяржавы № 78.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

### ЯК БУДЗЕМ ВЫХОДЗІЦЬ НА ПЕНСІЮ

**З 2017-га кожны год будзе ўстанаўлівацца «новы» пенсійны ўзрост шляхам яго павышэння ў адносінах да папярэдняга года на 6 месяцаў.**

**ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ СКЛАДЗЕ...**

у 2017 годзе:
для мужчын — 60 гадоў 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1957 г.),
для жанчын — 55 гадоў 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1962 г.);
у 2018 годзе:
для мужчын — 61 год (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 ліпеня па 31 снежня 1957 г.),
для жанчын — 56 гадоў (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 ліпеня па 31 снежня 1962 г.);
у 2019 годзе:
для мужчын — 61 год 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1958 г.),
для жанчын — 56 гадоў 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1963 г.);
у 2020 годзе:
для мужчын — 62 гады (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 ліпеня па 31 снежня 1958 г.),
для жанчын — 57 гадоў (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 ліпеня па 31 снежня 1963 г.);
у 2021 годзе:
для мужчын — 62 гады 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1959 г.),
для жанчын — 57 гадоў 6 мес. (у другім паўгоддзі пенсія можа быць прызначаная народжаным з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1964 г.);
З 2022 года пенсіі будуць прызначаць мужчынам — у 63 гады, жанчынам — у 58 гадоў.

## Адукацыя

# Удыхнуць «жывую душу» ў падручнік можа толькі настаўнік

**Прыцягненне педагогаў-практыкаў да стварэння новых падручнікаў і вучэбна-метадычных комплексаў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА лічыць ключавым момантам і залогам таго, што падручнік будзе станоўча ацэнены ўсімі: і прафесіяналамі, і вучнямі, і іх бацькамі. Такую думку ён выказаў падчас удзелу ў Фестывалі вучэбнай кнігі, арганізаваным Нацыянальным інстытутам адукацыі.**

— Галоўнае, каб пры падрыхтоўцы вучэбна-метадычнага комплексу мы абапіраліся на пазітыўны досвед, напрацоўкі нашых настаўнікаў-практыкаў, асабліва настаўнікаў- метадыстаў, педагогаў з вялікім прафесійным стажам і багажом, — падкрэсліў міністр. — Падручнік павінен суадносіцца з нашай дзяржаўнасцю, з практычнымі напрацоўкамі ў сістэме адукацыі, быць вытрыманым з пункту погляду навуковасці. Калі ў нас атрымаецца ўсё гэта спалучыць, то, напэўна, мы зможам казаць пра высокую якасць...

Ігар Карпенка высока ацаніў прадстаўленыя на выставе вучэбныя выданні, адзначыўшы, што настаўнікам сёння не даводзіцца вынаходзіць веласіпед пры падрыхтоўцы да ўрокаў. Яны ўсім для гэтага забяспечаны. А вось у чым наша школа недапрацоўвае, дык гэта ў рабоце з бацькамі: яны праецыруюць сваё ўспрыманне школы і падручнікаў, па якіх вучыліся, на тое, што мы маем сёння. І калі не знаходзяць у падручніках таго, што было там раней, пачынаюць іх крытыкаваць. Але ўмовы вакол нас змяняюцца, змяняюцца сучасныя дзеці, развіваецца навука, у тым ліку педагагічная, удасканальваюцца навучальныя тэхналогіі...

— Калі мы будзем прысвячаць бацькоўскія сходы не толькі пытанням умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, але і пытанням удасканалення адукацыйнага працэсу, то, упэўнены, атрымаем надзейных саюзнікаў у плане ацэнкі той вялікай вучэбна-метадычнай работы, якую здзейснілі ўсе нашы структуры, аўтарскія калектывы і наватары-практыкі, — дадаў Ігар Карпенка. — Да таго ж нават наяўнасць самага сучаснага вучэбна-метадычнага комплексу зусім не гарантуе чаканага эфекту, калі асобасныя і прафесійныя якасці настаўніка не дазваляюць яму стварыць непаўторны ўрок. Таму ўся наша праца будзе дарэмнай, калі мы не будзем клапаціцца пра павышэнне прафесійнага ўзроўню педагагічнага саставу. Прычым мы павінны думаць не толькі пра кадры для агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але і пра кадры для вышэйшай школы. Праблема стварэння якасных падручнікаў патрабуе грамадскага абмеркавання і сур'ёзнага паглыблення ў праблематыку для таго, каб удасканаліць змест адукацыі ў цэлым.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Манеты

# Птушка года ў срэбры і нікелі




**Нацыянальны банк Беларусі выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Гогаль звычайны» серыі «Птушка года», паведамляе прэс-служба рэгулятара.**

Намінал сярэбранай манеты — 10 рублёў, і выраблена яна са сплаву пробы 925 (тыраж — 1 тысяча штук). Медна-нікелевая манета выпушчана наміналам 1 рубель, тыраж яе склаў 2 тысячы штук. У цэнтры аверса манеты — выява птушаняці на стылізаваных далонях. У цэнтры рэверса ў авале, які сімвалізуе яйка, знаходзіцца рэльефная выява птушкі. Манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — кант, які выступае па акружнасці. Бакавая паверхня манет з насечкай.

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Беларусі, абавязковым да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без якіх-небудзь абмежаванняў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# МІШКАВА СПРАВА

## У Глускім раёне адкрываецца майстэрня для людзей з абмежаванымі магчымасцямі

**Знайсці Мішку ў Глуску зусім не складана. Непадалёк ад цэнтра гарадскога пасёлка стаіць сімпатычны драўляны домік, чымсьці падобны на казачны церамок. Гэта і ёсць яго майстэрня па рамонце абутку. Мішка — выхаванец Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Там ён і атрымаў сваю прафесію. Раней яго паслугамі карысталіся ў асноўным свае, веснаўскія, але з 1 верасня ў Глуску афіцыйна запрацаваў спецыяльна створаны для Мішкі кіёск. Яго ўрачыста адкрывалі ўсім раёнам з удзелам міністра працы і сацыяльнай абароны.**

### МАЙСТАР ПА АБУТКУ

Лёс Мішку не шкадаваў. З дома дзіцяці ён трапіў у дом-інтэрнат. Хлопчыка апякала тутэйшая санітарка, якая потым забрала яго да сябе. Толькі хутка шчасце скончылася: жанчына цяжка захварэла і памерла. Мішка зноў вярнуўся ў інтэрнат. Зараз ён амаль самастойны чалавек. Жыве ў райцэнтры, у доме, які пабудавалі для дарослых выхаванцаў інтэрната ірландскія дабрачынцы. Яго і яшчэ 8 яго таварышаў дагледае санітарка. Бо ўсе жыхары гэтага дома — інваліды 2-й групы з рознымі захворваннямі. Мішка адзіны, хто працуе ў райцэнтры. Астатнія ездзяць у Веснава, дзе для іх створана майстэрня па дрэваапрацоўцы.

Мішка шчаслівы: не кожны з мясцовых жыхароў можа пахваліцца асабістым кіёскам у цэнтры гарадскога пасёлка. Але гэта летні варыянт. На зімовы час яго майстэрня пераехала ў капітальны будынак. У пакоі, які займае Мішка, пахне абутковым клеем і скурай. У шафе на палічках стаяць адрамантаваныя туфлі і боты.

Хлопец не супраць расказаць нешта пра сябе, але ў яго сур'ёзныя праблемы з маўленнем і трэба яшчэ зразумець, што ён гаворыць. Звяртаю ўвагу, што некаторыя яго спадручныя матэрыялы не айчыннай вытворчасці. «Клей мне прывезла мая ірландская маці. Вельмі трывалы», — тлумачыць ён і шчодра намазвае ім абцас бота, дзе будзе набойка. Установу працяглы час апякае дабрачынная ірландская арганізацыя. Валанцёры ад яе прыязджаюць амаль кожны месяц, у адрозненне ад біялагічных бацькоў. Дакладней будзе сказаць, большасць гэтых хлопчыкаў і дзяўчатак зусім не ведае сваіх бацькоў. Для іх роднымі сталі ірландскія сем'і. Ім яны шлюць навагоднія паштоўкі і з нецярпеннем чакаюць лета, каб зноў сустрэцца. Мішка не выключэнне. Кожнае лета ён наведвае сваю прыёмную сям'ю ў Ірландыі і ляцела ён назад з... — пачакай, «ірландскай маці». І вяртаецца адтуль з цэлым багажом падарункаў. Вунь на акне стаіць ірландскі тэрмас, рэч таксама вельмі якасная і зручная. Зараз, калі ў Мішкі з'явілася праца, замежныя дабрадзеі забяспечваюць яго неабходнымі прыладамі. Той жа шліфавальны станок, на якім ён апрацоўвае абутак, лапа, ніткі, фарба — усё гэта з Ірландыі.

А вось на радзіме асноўныя Мішкавы сябры — гэта выхавальнікі і таварышы па інтэрнаце. Пра свайго настаўніка, які навучыў яго раманціраваць абутак, Міша кажа з вялікай удзячнасцю. Гэта ён перадаў яму ўсе прамудрасці прафесіі.

### НЕРАБОЧАЯ ГРУПА?

На сцяне дырэктара Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Вячаслава Клімовіча шмат дыпломаў і падзяк рэспубліканскага ўзроўню. За мінулы год установа заняла другое месца ў краіне па лепшую пастаноўку работы па абслугоўванні і стварэнні здаровых і бяспечных умоў для пражывання пенсіянераў і інвалідаў. Зараз тут рэалізуюць наватарскую ідэю па працаўладкаванні людзей з другой групай інваліднасці. Пакуль гэтая катэгорыя лічыцца ў краіне недзеяздольнай. Толькі Вячаслаў Клімовіч гатовы паспрачацца.

— Вось Мішу зрабілі асобны кіёск, і ён адразу ж уліўся ў гарадское асяроддзе, — радуецца кіраўнік. — Некаторыя з гараджан спачатку сумняваліся ў яго магчымасцях, але ж хутка зразумелі, што ён — прафесіянал. І хлопец адразу заваяваў аўтарытэт і кліентуру.

Знайсці занятак для такіх, як Мішка, цяжка, але гэта не значыць, што яны не могуць працаваць.

Вячаслаў Клімовіч упэўнены: прыкладна трэць з болей чым 170 выхаванцаў інтэрната, у якіх менавіта другая група, здольны прыносіць рэальную карысць грамадству. Тут ужо паказваюць прыклад таго, як гэта можа быць. У работу запушчаны праект па стварэнні майстэрань па дрэваапрацоўцы, пад які па лініі ПРААН выдзелена 18 тысяч долараў. Ён рэалізуецца з дапамогай раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Менавіта гэтая служба будзе аказваць дапамогу з падвозкай будучых работнікаў. Пакуль такіх знайшлося чатыры. Але ўсе яны з III групай. Для таго каб допусціць да працы людзей з II групай, павінна быць станоўчае заключэнне МРЭК. І тут без папраўкі ў закон нічога не зробіш. Калі б II група стала рабочай, той жа цэнтр сацыяльнага абслугоўвання хутка знайшоў бы работнікаў для сталярнай майстэрні. Па словах яго дырэктара Анжэлы Палупанковай, жадаючых сярод тых 30 чалавек, якія займаюцца пры аддзяленні дзённага прабывання для інвалідаў, ёсць.

— Зараз у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны разглядаецца пытанне з працаўладкаваннем гэтай катэгорыі, — кажа Вячаслаў Клімовіч. — Мы прымаем у гэтым непасрэдны ўдзел, паказваем, што ўмеюць такія людзі. У міністэрстве ўжо ўпэўніліся, што нельга ўсіх з II групай інваліднасці пазбаўляць дзеяздольнасці, дзесьці дастаткова проста абмяжоўваць. Сёлета ў Гомелі праходзіў метадычны савет Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, дзе разглядалася пытанне дзеяздольнасці і частковага аднаўлення дзеяздольнасці для людзей з II групай.

Сталярная майстэрня, створаная на тэрыторыі Веснаўскага дома-інтэрната ў рамках праекта, афіцыйна адкрыецца ў апошні тыдзень 2016 года. Потым з'явіцца яшчэ адна. Па ўмовах дагавора ініцыятары праекта павінны ўкласці раўназначную выдзеленай дапамозе суму.

Дадатковыя плошчы майстэрань разлічаны менавіта на людзей з раёна, якіх будзе падвозіць Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. Ад будучых работнікаў зусім не патрабуецца веданне справы. Спецыялісты дома-інтэрната навучаць усім неабходным маніпуляцыям.

Вячаслава Клімовіча хвалюе толькі адзін момант. Пры ўнясенні змяненняў у заканадаўства тым інвалідам II групы, якія здольны працаваць, абавязкова павінна захоўвацца пенсія.

— Інваліднасць дае невялікую фінансавую незалежнасць — пенсію, але на гэтыя грошы пражыць немагчыма, — аргументуе ён. — Праца, якую мы прапануем, не вельмі высока аплачваецца. Здароваму чалавеку яна нецікавая. А вось інваліду з улікам пенсіі дае магчымасць жыць больш-менш прыстойна. У нас ёсць дзеці з цяжкай паталогіяй, здольныя выконваць толькі пэўныя аперацыі. Яны не змогуць замяніць паўнавартаснага работніка.


Мішка робіць справу якасна.


Леанід УЛАСІК з Паўлам АНАНІЧАМ працуюць над будучай скульптурай для дзіцячай пляцоўкі.

### ЗАЛАТЫЯ РУКІ

У новай майстэрні прыемна пахне свежым дрэвам. Яна пакуль працуе ў тэставым рэжыме. Тут усталяваны набытыя нядаўна станкі і іншыя неабходныя для работы прылады. З іх дапамогай будуць ствараць нарыхтоўкі для будучай мэблі, з якіх потым зробяць крэслы, зэдлікі, сталы, лыжкі... Нават кіёск для Мішкі і шыкоўны рэкламны шчыт збіраліся на гэтай вытворчасці. Майстар па рамонце абутку, дарэчы, таксама прыклаў да гэтага рукі. У свае выхадныя дні ён прыязджае ў Веснава, каб разам з іншымі збіраць мэблю. Настаўнікі вельмі задаволены яго працай. Кажуць, за што ні возьмецца, у яго ўсё атрымліваецца. Залатыя рукі.

Пакуль створана дзве працоўныя групы па 6 чалавек. Працэсам кіруюць вопытныя прафесіяналы — майстрывыхавальнікі Леанід Уласік і Аляксандр Шарамет. Выхаванцы старанна выконваюць іх заданні. Хутка да іх далучацца жыхары Глускага раёна.

— Вытворчыя плошчы дазваляюць адкрыць 20 працоўных месцаў, — удакладняе Аляксандр Шарамет. — Ёсць ужо падрыхтаваная група маладых людзей, якім больш за 18 гадоў. Яны могуць шліфаваць, збіраць мэблю. Наогул нашы выхаванцы шмат чаго ўмеюць: займаюцца выпальваннем, выпілоўваннем лобзікам, разьбой па дрэве...

Павел Ананіч пад кіраўніцтвам выхавальніка Леаніда Уласіка робіць зайца з газасілікатнага блока. На тэрыторыі інтэрната ёсць дзіцячая пляцоўка, дзе плануецца ўсталяваць скульптуру. Там ужо знаходзіцца шмат зробленага рукамі тутэйшых умельцаў.

Намеснік дырэктара Таццяна Карповіч пасля экскурсіі па новых аб'ектах запрашае паглядзець на гэта казачнае месца. Пляцоўка сапраўды сімпатычная — домік з горкай і катом на трубе, альтанкі, скульптуры з дрэва. «Грамадства думае, што нашы дзеці нічога не ўмеюць, а яны шмат на што здольныя, — кажа Таццяна Уладзіміраўна. — Яны могуць выконваць любую манатонную работу, тое, што звычайнаму чалавеку хутка надакучае. Паглядзіце, якія сапраўдныя творы мастацтва атрымліваюцца. Такой Бабы-Ягі, як у нас, дакладна нідзе няма».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

***P.S.** Сёння ў рамках акцыі «Нашы дзеці» Веснаўскі дом-інтэрнат наведаюць віцэ-прэм'ер Міхаіл РУСЫ і старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.*

### Каментарый у тэму

**Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Глускага райвыканкама Алена КІРЭЙ:**

— Людзі з абмежаванымі магчымасцямі праходзяць рэабілітацыю на базе нашага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання. Сёлета там працаўладкавалі швачку і рабочага па мыцці і рамонце бялізны. На працягу года да нас звяртаецца некалькі інвалідаў III групы. Зараз жадаюць працаўладкавацца два чалавекі з сельскай мясцовасці. Шукаем для іх варыянты.

Калі казаць у цэлым пра раён, то сёлета за кошт стварэння новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў прапанавана 18 працоўных месцаў. Чатыры чалавекі атрымалі субсідыі на занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю.


Приорбанк RZB Group

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Добро пожаловать в Приорбанк»

Организатором рекламной игры является «Приорбанк» ОАО, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, УНП 100220190.

Наименование рекламной игры: «Добро пожаловать в Приорбанк», территория проведения — Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: с 1 марта 2016 г. по 31 декабря 2016 г. (включая период розыгрыша, вручения приза и опубликования результатов рекламной игры).

Свидетельство о государственной регистрации №2709 от 25.02.2016 г. Выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

В трех этапах рекламной игры «Добро пожаловать в Приорбанк» приняли участие 12 538 человек. В розыгрыше главного приза рекламной игры участвовало 15 728 человек.

Призовой фонд стоимостью 14 985 (четырнадцать тысяч девятьсот восемьдесят пять) белорусских рублей разыгран полностью.

**ПОБЕДИТЕЛЯМИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ СТАЛИ:**

| ФИО победителя | Приз |
|---|---|
| **1 этап** | |
| Бриткин Александр Вячеславович | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Годзевич Александр Георгиевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Губарев Сергей Александрович | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Евдокимова-Казерская Елена Юрьевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Иванова-Родик Мария Николаевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Концевой Максим Геннадьевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Минкевич Олеся Сергеевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Новикова Ольга Ивановна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Труфанова Наталья Валерьевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Якимчик Дмитрий Георгиевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |

| ФИО победителя | Приз |
|---|---|
| **2 этап** | |
| Бавдей Ольга Валерьевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Щетко Андрей Михайлович | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Радкевич Юрий Викторович | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Яцкевич Максим Валерьевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Малявко Марина Андреевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Крук Дарья Андреевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Бондюш Павел Тадеушевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Рамук Александр Францевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Товстыка Яна Геннадьевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Шемерей Анна Николаевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| **3 этап** | |
| Аврусевич Роман Витальевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Базан Алла Николаевна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Денисюк Алина Вячеславовна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Дорошевич Татьяна Владимировна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Логиш Ольга Ивановна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Мацкевич Ирина Михайловна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Осипенко Ирина Петровна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Примак Ирина Александровна | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Типунов Николай Иванович | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| Шуманский Иван Витальевич | Денежный приз 300 (3 000 000) рублей |
| **Главный приз** | |
| Зацаринная Татьяна Иосифовна | Сертификат на двоих на тур в Вену (8 дней/7 ночей) |
| | Дополнительный денежный приз 800 рублей |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры – (017) 289 90 90.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ (ул. Тетки, микрорайоны «Зарица-5», «Южный-4») в собственность в г. Гродно 31 января 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, (с учетом деноминации), руб. | Начальная цена продажи, (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-1*,** | В районе дома № 29 по ул. Тетки | 0,1047 | 440100000002009036 | 2 924,56 | 53 033,0 | 10 000 |
| 2 | Земельный участок У-190* | Микрорайон «Зарица-5» | 0,1035 | 440100000003004954 | - | 13 558,5 | 2 800 |
| 3 | Земельный участок У-121* | Микрорайон «Южный-4» | 0,1199 | 440100000003003763 | - | 24 111,4 | 5 000 |

**Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.*

*** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земельного участка в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения. На участке находятся хозяйственные постройки, которые подлежат сносу.*

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 31 января 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток не позднее **25 января 2017 года** в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет №3012000041810 в филиале № 400 в Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится б белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

**предоставить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;**

- заявление на участие в аукционе установленной формы;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка;
- подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно предоставляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 26 декабря 2016 года по 25 января 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37.**

**Официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

# РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже здания санатория-профилактория, принадлежащего ОДО «Белпромстрой» на праве собственности

| ЛОТ №1 | Адрес | Начальная цена продажи с учетом НДС 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Санаторий-профилакторий с инв. №443/С-5996. Назначение: Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения 1984 г.п. Количество этажей – 3. Общая площадь – 3690,6 кв.м. Стены кирпичные. Число жилых комнат – 50. Составные части и принадлежности: Трехэтажное блочное здание (А 3/к) с подвалом ((А 3/к)). Наличие инженерных коммуникаций: водопровод, канализация, электроосвещение, теплоснабжение, телефонная связь, горячее водоснабжение, вентиляция. Элементы благоустройства: ограждение, тротуарные дорожки, озеленение | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, д. Залесье | 150 000,00 | 15 000,00 | 10 000,00 |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 7,2745 га с кадастровым номером 425682003101000099. Целевое назначение: Земельный участок для обслуживания санатория-профилактория «Залесье». Право постоянного пользования.

Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос:

- Водоохранная зона водного объекта, площадь 7,2745 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) дней с назначенной даты проведения аукциона.

Срок оплаты, приобретенного на аукционе Объекта, порядок передачи права собственности на Объект согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом. Возможна рассрочка оплаты и передача Объекта после получения предоплаты.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (Трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 27.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **25.01.2017 в 11.00.**

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже санатория (Лот № 1), принадлежащего ОДО «Белпромстрой», **проводимом 27 января 2017 г.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта Жуков Сергей Николаевич, (8 029) 369 69 51.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3-й этаж • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Утерянный страховой полис «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВА № 8044707 в количестве 1 штуки в представительстве Белгосстраха по Слуцкому району **считать недействительным.** УНП 600013344

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 412/С-22638 (назначение – здание административно-хозяйственное 22910, наименование – одноэтажное кирпичное административное здание), площадью 172,6 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15, административное здание около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22639 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта 22600, наименование – одноэтажное кирпичное здание гаража), площадью 187,9 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15/2, здание гаража около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22642 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта 22602, наименование – одноэтажное блочное здание гаража), площадью 202,1 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15/1, здание гаража около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22925 (назначение – здание нежилое, наименование – одноэтажное блочное здание ремонтной мастерской), площадью 202,8 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15/3, здание ремонтной мастерской около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22647 (назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов 22504, наименование – одноэтажное блочное здание цеха по производству пленки), площадью 368,5 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15/4, здание цеха по производству пленки около д. Мосты Левые |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424084302101000178 (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для обслуживания зданий гаражей, административного здания, здания ремонтной мастерской, здания цеха по производству пленки)), площадью 2,5544, расположенный по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 15, около д. Мосты Левые. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 В, код – 5.2, площадью 0,2532 га |
| **Начальная цена продажи** | 57 016,51 р. (пятьдесят семь тысяч шестнадцать рублей пятьдесят одна копейка) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 5701 р. (пять тысяч семьсот один рубль) |
| **Обременения со стороны 3-х лиц** | Аренда производственного помещения, площадью 202,8 кв.м, и помещения под офис, площадью 8 кв.м |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | - капитальное строение, инв. № 412/С-22650 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель 22503, наименование – одноэтажное блочное здание сушилки), площадью 55,4 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/5, здание сушилки около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22648 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель 22503, наименование – одноэтажное блочное здание пилорамы), площадью 251,7 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/4, здание пилорамы около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22645 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель 22503, наименование – одноэтажное кирпичное здание столярного цеха), площадью 606,7 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/3, здание столярного цеха около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22643 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 22908, наименование – одноэтажное кирпичное здание склада № 3), площадью 1186,7 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/2, здание склада № 3 около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22644 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий 22502, наименование – одноэтажное кирпичное здание цеха по пошиву обуви), площадью 1320,4 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16, здание цеха по пошиву обуви около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22649 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 22908, наименование – одноэтажное блочное здание склада), площадью 24,0 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/6, здание склада около д. Мосты Левые.<br>- капитальное строение, инв. № 412/С-22926 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание лаборатории), площадью 31,3 кв.м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16/1, здание лаборатории около д. Мосты Левые. |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424084302101000179 (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для обслуживания здания сушилки, здания столярного цеха, здания пилорамы, здания склада № 3, здания цеха по пошивке обуви, здания склада, здания лаборатории)), площадью 3,9125, расположенный по адресу: Мостовский р-н, Мостовский с/с, 16, около д. Мосты Левые |
| **Начальная цена продажи** | 157 064,83 р. (сто пятьдесят семь тысяч шестьдесят четыре рубля восемьдесят три копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 15 706 р. (пятнадцать тысяч семьсот шесть рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ЗАО «Гудевичи», 231626, Мостовский р-н, д. Гудевичи, ул. Мира, 4, тел. 8-01515-38716 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,<br>г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 18 января 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.08.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 12 января 2017 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

■ Бягун вакол свету

# Сібір, кунг-фу і нашы дзяўчаты

**Прывітанне з Камбоджы перадаюць нам Кацярына, Аліса і Элізабэт БЯГУН, якія два месяцы таму адправіліся ў першую жаночую кругасветную вандроўку. У мінулы раз яны расказвалі нам пра свае планы. Паглядзім, якія з іх здзейсніліся падчас прыгод у Расіі, Манголіі і Кітаі.**



Тыдзень дзяўчаты вучыліся кунг-фу ў Майстра Шыфу.

## Наперад у Сібір!

Перасекчы Расію на цягніку — задача для стойкіх. Праехаўшы Маскву, дзе сям'я Бягун была ўжо не аднойчы, яны накіраваліся ў **Казань.** У гэтым горадзе 47% насельніцтва — татары, таму без знаёмства з нацыянальнай культурай не абышлося. Так, паводле слоў Лізы, найбольш незвычайным здалося тое, што раней багатыя жанчыны, каб паказаць свой статус, рабілі свае зубы чорнымі. Гэта азначала, што яны елі шмат цукру, які тады быў вельмі дарагі. Яшчэ прынята было апранаць на сябе ўсе ўпрыгажэнні, якія толькі былі. Калі месца не хапала — вешалі яшчэ стужку, на якую чаплялі каштоўнасці.

Кацярына расказвае, што ўпершыню пакаштавала каніну. На здзіўленне мяса проста раставала ў роце. На долю дзяўчат выпала яшчэ шмат кулінарных прыгод. Але Казань найбольш запомнілася Храмам усіх рэлігій, які ўзвышаецца над горадам як сведчанне таго, што талерантнасць стала свайго роду візітнай карткай сталіцы Татарстана.

Наступны прыпынак — **Новасібірск.** Але акунуцца ў сібірскую рэчаіснасць прыйшлося за некалькі прыпынкаў да гэтага горада. Мясцовыя жыхары на вакзалах прапанавалі шмат далікатэсаў. Самыя папулярныя — шыкоўная чырвоная ікра, шапкі і камізэлькі з пясца па кошце адной вячэры ў мінскім рэстаране. Кацярына гаворыць, што не купіць было вельмі складана, але набылі толькі рукавічкі. Сталіца Сібіры турыстычнымі славутасцямі не багатая. Дзяўчаты прайшлі па горадзе 17 кіламетраў і адзначылі адзін цікавы факт: там, у асноўным, ездзяць японскія мадэлі, палова з якіх з правым рулём. Такія ў Беларусі былі забароненыя яшчэ ў 2002 годзе.

З Новасібірска сям'я Бягун накіравалася ў **Іркуцк.** Там яны сустрэлі Алега Рудакова — чалавека, які ганарыцца тым, што беларус, не забывае родную мову. Ён заснаваў маладзёжную арганізацыю «Крывічы», якая прасоўвае беларускую культуру, бо ў Іркуцкай вобласці з часоў сталыпінскіх рэформаў засталося шмат нашых землякоў. Тут нікога не здзівіш святкаваннем Купалля. Маладзёжныя таварыствы вучаць беларускай мове, танцам, а з нядаўніх часоў стваравалі вышыванкі. Хлопцы робяць велізарную гістарычную працу: запісваюць амаль забытыя казкі, песні, вывучаюць старадаўнія дакументы. На сустрэчы з дзяўчатамі Алег жартуе: «Наша мэта — пазнаёміць як мага большую колькасць замежнікаў з Беларуссю і запрасіць іх да нас. Вось таму вы так рана і з'яздзаеце з Іркуцка. Тут кожны ведае пра Беларусь ад мяне». Жанчына, якая ўсё жыццё жыве ў Іркуцку, пачуўшы беларускую песню, расплакалася: «Мне бабуля спявала падобныя. Я ведаю яшчэ адну. Запішыце яе, калі ласка. А то яна знікне назаўсёды».

Возера Байкал дзяўчат здзівіла неймаверна. Яны нацешыліся сонцам і прыродай, атрымалі ад гэтага вялізнае задавальненне, зарадзіліся моцнай энергіяй і накіраваліся далей ва Улан-Удэ. Як кажа Элізабэт, яна не чакала, што гэты горад будзе такім прыемным. «Для мяне было крыху дзіўна, што тут столькі азіятаў, але ўсе яны гавораць на рускай мове нават паміж сабой. Вядома ж, тут мы ўбачылі самую вялікую ў свеце галаву Леніна. Яго вочы — як у Джаконды: з якога боку ні глядзі, заўсёды зазіраюць табе ў душу».

## Спаць? Па чарзе

Перасекчы расійска-мангольскую мяжу было даволі проста. У гэтай краіне яны планавалі застацца толькі на дзень, таму часу было няшмат. Ліза гаворыць, што «пакуль едзеш па Манголіі,назіраючы за яе абшарамі, можна ўлюбіцца ў гэтую краіну: утульныя юрты, якія знаходзяцца за кіламетры адна ад адной, чароўныя пустынныя краявіды, бязлюддзе... Але, як толькі выходзіш на вакзале ва **Улан-Батары,** на цябе навальваецца неверагодная колькасць людзей, якія ад цябе нагосьці хочуць, але ты нічога не разумееш, бо гавораць яны толькі па-мангольску. Старое пакаленне яшчэ можа трохі размаўляць на рускай мове, бо яны раней яе вучылі ў школах».

Калі вы бываеце не вельмі задаволеныя тым, што ў беларускім плацкарце сусед зверху можа на некаторы час прысесці на вашу ніжнюю паліцу, то вам няма чаго рабіць у цягніку да Замын-Ууд. У вагоне разам з нашымі трыма дзяўчатамі на іх месца прэтэндавала яшчэ столькі ж людзей. Як спаць? Па чарзе. Калі ты ноччу адлучышся па справах, знойдзеш на сваёй лаўцы новага мангола. У такіх умовах пасцельная бялізна — залішняя раскоша. Спалі, укрываючыся курткамі.

Састаў спыняецца — гонка пачалася. «Як толькі цягнік спыніўся, я адчула сябе героем фільма «Галодныя гульні», — гаворыць Ліза. — Усе людзі беглі да аўтобусаў і машын, як быццам гулялі на выжыванне. Да нас падышоў мангольскі мужчына, паўтараючы «Чайна, Чайна», мы зразумелі, што ён будзе нашым праваднікам». Перасякаць мангольска-кітайскую мяжу можна толькі на транспарце, таму, развітаўшыся з гэтым аўто, дзяўчаты перaселі ў іншы джып і накіраваліся ў Паднябесную.

## Пустыня дыназаўраў

На тэрыторыі Кітая яны пераселі ў вядомы «сліп-бас». Гэта калі ў аўтобусе размешчаны тры рады двухпавярховых ложкаў, зробленых пад выгібы цела. «А выехаўшы ў пустыню, можна ўбачыць з другога яруса цэлы парк Юрскага перыяду! Тут калісьці знайшлі вялікую колькасць акамянеласцяў дыназаўраў. Вось кітайцы і вырашылі пазначыць гэтае месца дзясяткамі жалезных статуй. Калі бачыш застылага ў руху раптара пасярод пустыні на фоне млыноў, гэта моцна ўражвае», — расказвае Аліса.

Кожны сучасны чалавек сутыкнецца ў Кітаі з адной праблемай: павольны інтэрнэт. І гэта да таго, што даволі шмат сайтаў — Фэйсбук, Ютуб ці нават звычайны пошукавік Гугл — не працуюць. Для таго, каб імі карыстацца, трэба спампоўваць спецыяльныя абходныя праграмы на тэлефон. Іншая нязручнасць — англійская мова для кітайцаў амаль такая ж незнаёмая, як і беларуская. Гэта перашкаджае выбіраць ежу ў мясцовых кафэ. Зараз у кітайскіх рэстаранах хіт — велізарная талерка супу з локшынай, мясам і гароднінай. Адной порцыі хапае, каб наесціся. Гэтым і сілкаваліся нашы дзяўчаты на чужыне. Ліза з Алісай расказваюць, што з салодкім там увогуле бяда: якасны дэсерт, да якога мы прывычныя, знайсці цяжка і ён дарагі. Увогуле, **Пекін** не вельмі ўразіў нашых вандроўніц. Самы прыемны ўспамін — Вялікая Кітайская сцяна. Таму, не затрымліваючыся, яны накіраваліся ў наступны буйны горад — **Шанхай.**

Кацярына гаворыць, што Шанхай для яе — гэта любоў з першага погляду. Там жа дзяўчаты далі прэс-канферэнцыю разам з Генеральным консулам Беларусі ў Шанхаі Валерыем Мацэлем. Спадар консул адзначыў, што «гэта падарожжа — праява народнай дыпламатыі і нацэлена на ўмацаванне дружбы паміж народамі Беларусі і Кітая, уносіць свой уклад у рэалізацыю гуманітарнага складніка эканамічнага пояса Шаўковага шляху».



Уладзімір Ільіч сочыць за жыхарамі Улан-Удэ са свайго пастамента.

## Выліты Панда

Далей шлях праходзіў праз **Чаншу — Кунмінь — Далі.** А там яны споўнілі даўнюю мару — на тыдзень пайшлі ў манастыр вывучаць кунг-фу. Манастыр, у які яны трапілі, называецца «Ву Вэй Сі». Тыдзень знаходжання для аднаго чалавека каштуе каля $75. У кошт уваходзіць: трохразовае вегетарыянскае харчаванне, ложак і трэніроўкі. Дарэчы, жылі яны ў спартанскіх умовах — ніякіх празмернасцяў. А правілы, якія трэба прыняць, наступныя: абавязкова павінны быць доўгія штаны, якія цалкам закрываюць твае ногі, майка з рукавамі і закрыты абутак. Алкаголь і курэнне забароненыя. Нельга дакранацца да чалавека супрацьлеглага полу. Абавязкова трэба даядаць усю ежу, уключаючы кожную рысінку, якая ўпала на падлогу. За сталом нельга скрыжоўваць ногі. Дзень пачынаецца ў 5.30 з малітвы, а ў 21.30 выключаецца ўсё святло. Кожны раз, калі вы бачыце Майстра Шыфу, трэба пакланіцца і сказаць «амітофу», што значыць «поспехаў». Пачаць есці можна толькі пасля таго, як пачаў сам Майстар. Дарэчы, менавіта з яго зрабілі персанажа з мультфільма «Кунг-фу Панда». «Калі мы яго ўбачылі першы раз, мы не маглі паверыць сваім вачам: мульцяшны герой так падобны на сапраўднага! Ажыццявілася наша мара, і мы змаглі паесці з ім пельменяў», — успамінае Ліза.

Трэніровак у дзень дзве. А 7-й раніцы, калі не ідзе дождж, — бег. Вы бежыце ў цемры, з ліхтарыкам у руцэ па каменнай дарозе. Дабягаеце да рэчкі, бераце камень і кладзяце яго на галаву. Балансуеце і несяце яго без рук назад да манастыра. «Першыя тры трэніроўкі мы вучылі асновы кунг-фу, а потым — нешта тыпу звязкі з базавымі элементамі. Хлопцы казалі, што хутка ў нас так моцна будуць балець ногі, што мы не зможам хадзіць. Пасля першай трэніроўкі падумалі, што яны нейкія слабыя: мы нават амаль не стаміліся. Але потым зразумелі, пра што яны гаварылі».

— Я зразумела, што на многае здольная, і мая сястра таксама, — расказвае Элізабэт. — Пасля нашай апошняй трэніроўкі мы з гонарам абняліся і адчулі, што сталі мацнейшымі не толькі фізічна, але і псіхалагічна, не здаваліся і ішлі да канца, нават калі ногі не хацелі рухацца і трэба было дапамагаць рукамі. Разам плакалі і смяяліся, дзяліліся эмоцыямі, і падтрымлівалі адна адну, былі адной камандай, дзялілі пароўну апошні пельменьчык, дапамагалі ўстаць на ногі іншаму чалавеку і проста знайшлі кунг-фу сям'ю.

*Пра далейшыя прыгоды нашых дзяўчат у кругасветнай вандроўцы чытайце ў наступных нумарах «Звязды».*

**Надзея АНІСОВІЧ.**

*anisovich@zviazda.by*

■ Экатэхналогіі

# БелАЭС — супраць змянення клімату

**Увод ва эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі дапаможа знізіць выкіды ў атмасферу шкодных рэчываў і паспрыяць развіццю «зялёнай» эканомікі, упэўнены спецыялісты Мінпрыроды.**

## Арганічнае паліва страчвае папулярнасць

— Беларусь адной з першых прыняла Парыжскае пагадненне аб клімаце, у адпаведнасці з якім наша краіна ўзяла на сябе абавязацельствы забяспечыць да 2030 года скарачэнне выкідаў парніковых газаў больш чым на 28% у параўнанні з 1990 годам. Таму развіццё нізкавуглroднай энергетыкі становіцца прыярытэтнай задачай для беларускай эканомікі, — адзначыў **намеснік кіраўніка ўпраўлення Дзяржаўнай экалагічнай экспертызы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КАВАЛЕНКА.** — Увод ва эксплуатацыю БелАЭС дазволіць вырашыць шмат пытанняў.

Так, можна скарацiць выкарыстанне на дзеючых энергакрыніцах арганічнага паліва (прыроднага газу, мазуту, вугалю). Па словах спецыяліста, штогадовае замяшчэнне прыроднага газу можа скласці да 5 млрд м$^3$, што дазволіць вывесці з эксплуатацыі маральна састарэлае абсталяванне, адмовіцца ад будаўніцтва новых ЦЭЦ, што працуюць на арганічным паліве, устанаўліваць электракатлы.

Акрамя таго, выкарыстанне атамнай энергіі будзе садзейнічаць зніжэнню сабекошту электраэнергіі і ў сваю чаргу — сабекошту прадукцыі, у вытворчасці якой апошняя займае вялікую частку выдаткаў. Напрыклад, паспрыяць развіццю гарадскога электрычнага транспарту, які дазволіць палепшыць якасць атмасфернага паветра.

— Усё гэта дасць магчымасць скараціць выкіды забруджвальных рэчываў і парніковых газаў, а таксама зменшыць выкарыстанне кіслароду, неабходнага для спальвання арганічнага паліва, — падкрэсліў Васіль Каваленка.

## Смецце ператварыць... у энергію

Увод ва эксплуатацыю БелАЭС будзе садзейнічаць развіццю ў краіне «зялёнай» эканомікі, асабліва ў частцы перапрацоўкі ўсіх відаў адходаў, лічыць **старшыня савета Беларускага грамадскага аб'яднання «Экалагічная ініцыятыва» Юрый САЛАЎЁЎ.**

У нас ёсць увесь тэхнічны і тэхналагічны патэнцыял, дзякуючы якому магчыма перапрацоўваць як уласныя адходы, так і імпартуемыя. А таннай энергіяй, якую плануюць атрымліваць на БелАЭС, можна забяспечыць будучыя смеццеперапрацоўчыя заводы.

## Стымул для развіцця электратранспарту

Па словах **Андрэя ПІЛІПЧУКА, намесніка кіраўніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды,** у Беларусі існуе ўнікальная магчымасць для развіцця электратранспарту.

— У бліжэйшай будучыні доля электратранспарту ў свеце будзе толькі ўзрастаць, — адзначыў ён. — Гэта звязана як з пастапленнем на рынкі таннай электраэнергіі, так і з прарыўнымі тэхналогіямі ў вобласці захавання энергіі. Як заяўляюць буйныя вытворцы аўтамабіляў, у хуткім часе на рынку павінны з'явіцца электрааўтамабілі, кошт якіх будзе роўны кошту звычайнага аўтамабіля. Маючы вялікі транзітны патэнцыял, пры развіцці сферы электратранспарту краіна змагла б атрымаць дадатковыя эканамічныя стымулы.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

*kolasava@zviazda.by*

Паклон песнярам

# ІХ ЗОРКІ І СЁННЯ

## Багдановіч, Купала, Колас: юбілеі класікаў як усенародныя святы

**У канцы гэтага года наша краіна шырока адзначыла 125-годдзе Максіма Багдановіча. Свята атрымалася сапраўды маштабным і ўсенародным. Не толькі літаратурныя музеі і афіцыйныя ўстановы далучыліся да ўрачыстасцяў. Многія людзі на сваіх асабістых старонках у сацыяльных сетках разважалі віншаванні паэту, дэкламавалі вершы падчас імпрэз, наведвалі памятныя канцэрты. У наступным годзе нас таксама чакае некалькі юбілеяў беларускіх класікаў. У іх ліку — 130-годдзе з дня нараджэння Цішкі Гартнага, 105-годдзе Максіма Танка, 100-годдзе Янкі Брыля і Пімена Панчанкі. Але, думаецца, найбольш яркімі могуць стаць святы ў гонар двух песняроў, асабліва знакавых у станаўленні нацыянальнай літаратуры і дарагіх беларускаму народу, — 135 гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. І хоць самі святкаванні адбудуцца ўлетку і ўвосень, ужо сёння варта паклапаціцца пра тое, каб годна адзначыць дні нараджэння класікаў.**

**Ці можна неяк паўплываць на ўсенародную любоў? Якія імпрэзы варта запланаваць да юбілеяў? Што новага чакаецца ў працы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, куды нядаўна прыйшоў новы кіраўнік? На гэтыя і іншыя пытанні за «круглым сталом» у рэдакцыі «Звязды» шукалі адказы дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКОВІЧ, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Зміцер ЯЦКЕВІЧ, загадчык сектара ўліку і захоўвання фонду Максіма Багдановіча Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Алена КНІГА і намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Наталля КАРОТКАЯ.**


Алена ЛЯШКОВІЧ.



Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ.


Зміцер ЯЦКЕВІЧ.

### Наш гонар, наша зорка

**Зміцер ЯЦКЕВІЧ:** — Пэўна, зоркі так склаліся, што юбілей паэта быў адзначаны ў нашай краіне надзвычай годна. Я лічу, што такія асобы, як Максім Багдановіч, Янка Купала і Якуб Колас вартыя вялікай увагі і ўрачыстасцяў. Спадзяюся, наступны юбілейны год пройдзе на такім жа высокім узроўні. Бо чым больш праводзіцца такіх святаў у гонар нашых пісьменнікаў і паэтаў, тым больш упэўнена мы будзем адчуваць сябе на гэтай зямлі і ганарыцца сваёй Беларуссю.

**Алена КНІГА:** — Максім Багдановіч, як вядома, пайшоў з жыцця ва ўзросце 25 гадоў. Таму і праца нашага літаратурнага музея скіравана на маладое пакаленне. Мерапрыемствамі, імпрэзамі, якія ладзяцца ў музеі, моладзь прывучаецца да таго, што Максім Багдановіч — гэта наш гонар, наша зорка. У гэтым годзе адкрылася новая экспазіцыя — і гэта таксама значная падзея ў грамадскім жыцці. Акрамя таго, сёлета ў фонды музея мы атрымалі вельмі каштоўны прадмет — брашуру «Беларускае відраджанне», што выйшла пры жыцці паэта ў 1916 годзе ў Відневе (Вена). Гэта пераклад яго артыкула «Беларускае адраджэнне» на ўкраінскую мову. Такое выданне маецца толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у Славеніі, а таксама ў нас. Да таго ж у музей звярнуліся мастакі і падарылі свае работы да юбілею паэта, якія папоўнілі калекцыі графікі і жывапісу.

**Алена ЛЯШКОВІЧ:** — Адносна маштабнасці юбілею Багдановіча, мне здаецца, што тут супала адразу некалькі фактараў. Перш за ўсё, наша грамадства ўжо было падрыхтавана да гэтай урачыстасці, яно не чакала. Быў спрыяльны час, і мы аказаліся гатовы належным чынам адсвяткаваць. Таму, калі гаварыць пра выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, то пачынаць трэба найперш з сябе. Зараз нашы супрацоўнікі акурат гэтым і займаюцца.

### Новыя тэхналогіі як паказчык папулярнасці

**Наталля КАРОТКАЯ:** — У інтэрнэце вельмі лёгка заўважыць, наколькі папулярная тая або іншая тэма. Таму з упэўненасцю магу сказаць, што асоба Максіма Багдановіча выклікала на партале «Звязды» і сайце «Сугучча» вельмі вялікую цікавасць. Мы мяркуем аб гэтым па колькасці праглядаў матэрыялаў, звязаных з ім. Чаму? Па-першае, ён быў маладым чалавекам, стварыў такую пранікнёную лірыку. Да таго ж усё, што звязана з беларускасцю, сёння надзвычай папулярна ў моладзі.

Хачу спыніцца на адным праекце. На сайце sozvuchie.by мы зрабілі цэлы раздзел «Максім Багдановіч», дзе групаваліся ўсе матэрыялы пра Багдановіча. У тым ліку пераклады верша паэта «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы ...» на розныя мовы свету. Але хутка мы зразумелі, што з гэтага можа атрымацца мультымедыйны праект. «Максіма Багдановіча чытаюць на мовах народаў свету» мы зрабілі сумесна з вядомым літаратуразнаўцам Міколам Трусам. Меней з'явіўся ідэйным натхняльнікам задумы. Носьбітаў мовы мы шукалі па дыяспарах, у сацыяльных сетках, спрацавала і народнае радыё: нашы чытачы тэлефанавалі сваім знаёмым і прапаноўвалі прыняць удзел. Усяго мы зрабілі 19 відэасюжэтаў: пераклады на азербайджанскую, італьянскую, арабскую, японскую, партугальскую, польскую, эстонскую, літоўскую, англійскую, украінскую, іспанскую, татарскую, харвацкую, рускую, туркменскую, чачэнскую, кітайскую і карацінскую мовы. Мы вельмі ўдзячны Літаратурнаму музею Максіма Багдановіча і бібліятэцы-філіялу №8 імя Максіма Багдановіча, якія выдзелілі нам пляцоўку для здымак.

Праект аказаўся рэзанансным: яго прагледзелі болей за 6,5 тысячы чалавек, ідэю падхоплівалі іншыя, напрыклад, нашых чытачоў запрашалі ў бібліятэкі для таго, каб яны прачыталі верш Багдановіча на сваёй мове дзецям. У нас з'явілася шмат прапаноў, у тым ліку зрабіць у наступным годзе аналагічныя праекты, звязаныя з Янкам Купалам і Якубам Коласам.

Практыка работы ў інтэрнэце паказвае, што моладзь цікавіцца беларускай літаратурай і культурай. Але для іх прасоўвання трэба шукаць цікавыя формы падачы, выкарыстоўваць новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

### Купала, Колас і замежжа

**Алена ЛЯШКОВІЧ:** — 135-годдзе Купалы і Коласа ўжо не за гарамі. Каб гэтыя даты былі адзначаны належным чынам, каб яны не прайшлі афіцыйна-наменклатурна, мы таксама павінны пачаць з сябе, прааналізаваць усю нашу дзейнасць. Важна самім зразумець, чаго мы хочам і што плануем у гэты год? Думаю, што святкаванні пройдуць на высокім узроўні, мы ўжо маем пэўныя задумы. Напрыклад, распачынаем выставачны праект «Янка Купала ў дыялогу культур». Прааналізаваўшы творчасць Купалы, мы прыйшлі да высновы, што яго многае звязвае з бліжэйшымі суседзямі, і з краінамі Каўказа, і з еўрапейскімі краінамі. Ужо падрыхтаваны экспазіцыі да гэтага праекта, што паказваюць сувязь Янкі Купалы і Арменіі, а таксама Грузіі, Туркменістана, Славакіі, Францыі. Спадзяюся, што, калі мы арганізуем гэтыя выставы за мяжой, то абудзім цікавасць не толькі да нашага класіка, але і да Беларусі.

**Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ:** — Музей Якуба Коласа даволі плённа супрацоўнічае з роднаснымі музеямі Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы. Мы маем доўгатэрміновыя сумесныя распрацоўкі — як выставачныя, так і агульнаадукацыйныя.

Толькі сёлета музей-запаведнік «Міхайлаўскае» прадоўжыў цікавы праект «Пушкін у гасцях у Коласа» і парадаваў школьнікаў Мінска агульнаадукацыйнай праграмай «Музейны дэсант». Музеямі Санкт-Пецярбурга ладзіліся выставачныя форумы «Дастаеўскі ў гасцях у Коласа», «Блок у Доме Коласа».

У наступным годзе чакаем працягу нашай працы з літаратурным музеем імя Адама Міцкевіча ў Варшаве. Якуб Колас «пагасцюе» там са сваёй «Новай зямлёю», ён «завітае» і ў музей Бранеўскага ў Варшаве, а таксама ў музей Дастаеўскага ў Санкт-Пецярбургу. Такой сумеснай працай мы падкрэсліваем адкрытасць, якую меў Колас, яго прыязнасць да ўсіх, хто завітваў у дом, жаданне ладзіць і сябраваць з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў, у прыватнасці літаратарамі. У 2017 годзе спаўняецца 100 гадоў з таго часу, як Якуб Колас аказаўся падчас вайны ў Курску, — плануецца і там правесці ўрачыстасці сумесна з мясцовым кіраўніцтвам.

Ужо адзначалі, што сённяшняя моладзь скіравана да беларускасці — і я пагаджуся з гэтым. Літаральна днямі ў Дом Коласа завітала група школьнікаў, і было прыемнай нечаканасцю паслухаць песню на словы паэта, напісаную вучнем 7-га класа, — яго так натхніў верш «Ручэй».

### Нагода ўзгадаць

**Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ:** — У нас асаблівы музей — ён мемарыяльны — тэхнічныя сродкі ўводзім вельмі ашчадна. Таму вырашылі задзейнічаць дадатковыя пабудовы. Сёлета адкрылася вельмі добрая экспазіцыя ў былым гаражы Якуба Коласа. У калекцыі — аўтамабілі, якімі ў розныя часы карыстаўся паэт.

Сёлета завершана музеефікацыя сядзібы «Альбуць» у філіяле музея. У гаспадарчай пабудове створана стацыянарная выстаўка «Прырода роднага краю» з інтэрактыўнымі зонамі па матывах паэмы «Новая зямля», якая дапамагае вывучаць навакольны раслінны і жывёльны свет.

Сумесна з Літаратурным музеем Пушкіна ў Вільні ўжо распрацоўваецца экскурсія, якая называецца «Вандроўкі з Коласам па Вільні». А мы прапаноўваем гасцям і жыхарам сталіцы пешую экскурсію «Коласавы мясціны ў Мінску».

**Алена ЛЯШКОВІЧ:** — Не буду раскрываць усіх сакрэтаў, якія запланаваны на наступны год. Скажу толькі, што юбілеі — гэта нагода для грамадства ўзгадаць пра класікаў. Як бы мы ні любілі нашых песняроў, людзі ведаюць пра іх недастаткова... Дарэчы, ёсць дамова з чатырма гарадамі Славакіі аб усталяванні памятных дошак, прысвечаных Янку Купалу. Цяпер шукаем фінансы на рэалізацыю праекта. Гэта будзе ўнікальны выпадак нават у гісторыі сусветнай культуры — калі імя класіка адной краіны так пачэсна ўшанавана ў іншай. Спадзяюся, спонсары знойдуцца.

**Зміцер ЯЦКЕВІЧ:** — У наступным годзе нас чакаюць і 100-гадовыя юбілеі Пімена Панчанкі і Янкі Брыля — запланаваны адпаведныя выставы. Таксама будзе адзначацца 90-годдзе Алеся Адамовіча. На сённяшні дзень актывізавана праца па стварэнні музея пісьменніка ў вёсцы Глуша Бабруйскага раёна. Разам з калегамі будзем планаваць, як сумесна адзначыць юбілеі Купалы і Коласа. Бо ў фондах нашай установы маюцца музейныя прадметы, звязаныя з гэтымі класікамі: 359 прадметаў, датычных Янкі Купалы, і 451 прадмет, які мае сувязь з Якубам Коласам. Сярод гэтых матэрыялаў ёсць і надзвычай цікавыя — рукапісы, лісты, дакументы, кнігі з аўтографамі.

### Набыццё аўтэнтычных рэчаў

**Зміцер ЯЦКЕВІЧ:** — Што датычыцца галоўнага музея, то ў наступным годзе мы паспрабуем распрацаваць архітэктурна-мастацкае рашэнне пастаяннай экспазіцыі і адкрыць хаця б яе частку. Канцэпцыя пастаяннай экспазіцыі Дзяржаўнага музея гісторыі развіцця беларускай літаратуры заканчваецца 90-мі гадамі XX стагоддзя. Аднак беларуская літаратура на гэтым не спынілася сваё існаванне. Яна працягвае жыць і развівацца. Ужо сёння, на пачатку XXI стагоддзя, мы маем нобелеўскага лаўрэата. Гэта ганаровае званне прысуджана нашай суайчынніцы Святлане Алексіевіч. І гэтую падзею мы, безумоўна, не можам не адлюстраваць у нашых экспазіцыйна-выставачных праектах. На гэты конт у нас таксама ўжо ёсць пэўныя задумы. Такім чынам, перад намі стаіць вельмі няпростая задача — стварыць экспазіцыю, змястоўную, цікавую і, галоўнае, адпаведную ўсім патрабаванням сучаснага наведвальніка.

Паралельна будзем пашыраць дзейнасць і пералік паслуг, якія прапаноўваюць сёння наведвальніку нашы філіялы, раскіданыя па розных кутках краіны.

Асаблівая ўвага будзе нададзена камплектаванню музейных фондаў. У межах падрыхтоўкі да стварэння пастаяннай экспазіцыі музея ў


Фота БЕЛТА.
Адкрыццё новай экспазіцыі ў аднаўленным Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

# ГАРАЦЬ
## беларускай літаратуры


Алена КНІГА.


Наталля КАРОТКАЯ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

першую чаргу планueцца набываць прадметы музейнага значэння, якія будуць папаўняць ужо існуючыя калекцыі і адлюстроўваць літаратурны працэс на Беларусі ад старажытных часоў да XIX стагоддзя ўключна. Менавіта такіх матэрыялаў бракуе ў нашых фондах, аднак гэта натуральна, паколькі ўжо сёння ад тых часоў нас аддзяляюць стагоддзі. Акрамя гэтага, такія нашы філіялы, як музей Адама Міцкевіча ў Завоссі, Францішка Багушэвіча ў Кушлянах, таксама могуць быць дапоўнены рэчамі таго перыяду, калі там жылі гэтыя творцы, каб стаць яшчэ больш адметнымі і знакавымі.

Ужо вядзецца праца ў кірунку набыцця аўтэнтычных рэчаў. Але пакуль не будзем раскрываць таямніц, каб удалося здзейсніць усё задуманае (натуральна, гэта будзе залежаць і ад нашых фінансавых магчымасцяў). Важна мець не муляжы, а знакавыя прадметы ў экспазіцыях, каб наглядна бачыць, як развівалася наша пісьменства і літаратура.

У планах пашырыць і навукова-даследчую працу па шэрагу кірункаў, у тым ліку і па стварэнні радаводаў класікаў беларускай літаратуры.

### Паміж класікамі і сучаснымі аўтарамі

**Зміцер ЯЦКЕВІЧ:** — У нас штотыдзень праводзяцца імпрэзы, якія закранаюць не толькі класікаў, але і сучасных літаратараў — абсалютна розных па сваіх светапоглядах, успрыняцці рэчаіснасці, бачанні і разуменні мастацкага слова. Часам прыходзіцца звяртацца ў Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі для атрымання рэцэнзій на кнігі некаторых аўтараў. Спадзяюся, што і надалей будзем працягваць супрацоўніцтва з сучаснымі творцамі.

**Алена ЛЯШКОВІЧ:** — Калі сучасны аўтар напісаў верш, прысвечаны Янку Купалу, мы з задавальненнем возьмем у нашы фонды яго рукапіс. Але больш стасуемся з аўтарамі па лініі культурна-адукацыйнай працы. Мы паставілі сабе задачу стаць эксперыментальнай пляцоўкай для маладых творцаў — гэта музыканты, мастакі, паэты і празаікі, якія могуць зрабіць прэзентацыю сваёй творчасці ў нашым музеі. Думаю, прадстаўленне свайго мастацтва ў Літаратурным музеі — пэўная адказнасць для аўтара. Працуючы з моладдзю, мы думаем аб тым, што папулярызуем нашага Янку Купалу.

**Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ:** — У нас даволі актыўна праходзяць літаратурныя чацвяргі, прэзентуюцца кнігі, ушаноўваюцца пісьменнікі-юбіляры. Зараз карыстаецца попытам «Кватэрнік у дзядзькі Якуба» — нязмушаная сустрэча творчай моладзі. Там і бардаўскія песні спяваюць, і чытаюць уласныя вершы. Згодна, што прэзентаваць сваю кнігу ў літаратурным музеі — вялікі гонар для маладога аўтара. Таму можна сказаць, што і класікі, і сучасныя творцы ў пэўным сэнсе добра «супрацоўнічаюць».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# Пантэон Айчыны

## ВЯЧКА (?—1224) Кукенойскі князь



**Больш як два стагоддзі нашы продкі змагаліся з крыжакамі. Разам з беларусамі ў гэтай барацьбе ўдзельнічалі літоўцы, рускія, палякі, украінцы, латышы, эстонцы. Гэта было супрацьстаянне Захаду і Усходу. За крыжацкімі ордэнамі мечаносцаў і тэўтонцаў стаялі сілы ўсёй Заходняй Еўропы. Які лёс чакаў бы нашых продкаў, каб не перамаглі яны ў гэтай вайне?**

У сярэдзіне XII стагоддзя пачалася шырокая агрэсія нямецкіх феадалаў на ўсход, землі палабскіх, балтыйскіх і заходніх славян. На захопленых славянскіх землях узнікалі нямецкія герцагствы і графствы. Адразу ж пасля гэтага пачалася заваёва немцамі Усходняй Прыбалтыкі. Папа рымскі прыраўняў паход у Лівонію да крыжовага паходу ў Палесціну, але дзеля таго, каб мець пастаянную вайсковую сілу, каталіцкая царква заснавала ў Лівоніі вайскова-манаскі ордэн мечаносцаў. Папа Інакенцій III даў мечаносцам статут ордэна храмоўнікаў (тампліераў). Ордэн складаўся з братоў-рыцараў, братоў-святароў і братоў-служачых. Той, хто паступаў у Ордэн, даваў чатыры зарокі: паслухмянства Ордэну, дабрамудрасці, беднасці, прысвячэння свайго жыцця барацьбе з язычнікамі і ворагамі каталіцкай царквы. Кожны брат насіў на адзенні знакі адрознення — чырвоны крыж і меч, адсюль і назва Ордэна — мечаносцы. Жалезная дысцыпліна, добрая баявая вывучка, шчодрая падтрымка каталіцкай царквы рабілі Ордэн галоўнай сілай нямецкіх феадалаў у заваёве Усходняй Прыбалтыкі. Мечаносцы з фанатычным запалам распачалі сваю дзейнасць. «І залілі крывёю паганцаў усе дарогі і месцы. І захапілі яны многіх, і перабілі ўсіх мужчын, і звялі ў палон жанчын і дзяцей. Спустошылі і аддалі агню ўсе вясі, а мужчын, якіх захапілі, усіх спалілі жывымі», — пісаў ордэнскі храніст Генрых Латвійскі. Занадта позна зразумеў сваю памылку полацкі князь Уладзімір, які дазволіў каталіцкім святарам «хрысціць» падуладных яму ліваў. Золата, якое плаціў рыжскі біскуп замест даніны ліваў, асляпіла полацкага князя — і быў страчаны дарагі час.

Вячка княжыў у Кукенойсе, што знаходзіўся ў Лівоніі, і быў васалам полацкага князя. У 1206 годзе на дапамогу крыжакам прыбылі новыя атрады нямецкіх феадалаў, а таксама дацкае войска пад кіраўніцтвам караля Вальдамара. Становішча ў Лівоніі склалася не на карысць Полацка. Адчуўшы сілу, Ордэн ад тактыкі ўступак палачанам, мірных пагадненняў з імі пераходзіць у наступ. Крыжакі напалі на Кукенойс і захапілі яго. Адкрыта далучыць Кукенойскае княства да ордэнскіх уладанняў рыжскі біскуп не наважыўся, таму ён вярнуў горад Вячку з умовай размясціць там крыжацкі гарнізон. Ганарлівы Вячка паўстаў супраць Ордэна: ён расправіўся з варожым гарнізонам, спаліў замак і адправіўся на Русь. Гэта адбылося ў 1208 годзе.

Да 1224 года пра Вячку няма ніякіх звестак у летапісах. Чым займаўся ўвесь гэты час былы кукенойскі князь? Не будзе перабольшаннем сказаць, што так і не ўклаў у похвы ён свой меч, працягваў ваяваць з крыжакамі. Вячка паступіў са сваёй дружынай на службу Ноўгараду, і, відаць, удзельнічаў у паходах наўгародцаў у Лівонію і Эстонію. Як вопытнага і смелага ваяводу наўгародцы пасылаюць Вячку ў Юр'еў (цяпер Тарту) — фарпост Ноўгарада ў эстонскай зямлі. Да 1219 года крыжакі з дапамогай дацкіх войскаў захапілі Паўночную Эстонію і працягвалі наступ на эстонскія землі. З'яўленне ў Юр'еве Вячкі выклікала ўздым вызваленчай барацьбы эстаў супраць крыжакоў. Супраць Вячкі ў Рызе пачынаюць рыхтаваць паход. Было сабрана вялікае войска, у склад якога ўвайшлі мечаносцы, паломнікі, купцы, гараджане Рыгі, дружыны ліваў і лэтаў. Вайсковыя сілы ўсёй Лівоніі і Эстоніі былі кінуты на Юр'еў. З самага пачатку паходу крыжакі прыняліся за рабаўніцтва сёлаў эстаў. Падышоўшы да Юр'ева, ордэнскія войскі разбілі стан і шчыльным колам абклалі горад. Восем дзён крыжакі будавалі абложныя машыны, катапульты, штурмавую вежу з узроўнем замка. Вежу насунулі над ровам і пад яе абаронай крыжакі спусціліся ў роў і пачалі падкопвацца пад вал. Каб аблегчыць штурм замка, крыжакі паслалі да Вячкі паслоў і прапанавалі яму «вольны шлях для выхаду з яго людзьмі, коньмі і маёмасцю, толькі б ён пакінуў замак і гэты народ (эстаў. — **В.Ч.**) адступнікаў». Вячка разумеў, што горад не абараніць: рана ці позна вораг захопіць яго — занадта няроўныя былі сілы, але ён адмовіўся ад ордэнскай прапановы.

Многа дзён доўжылася аблога. Крыжакі абстрэльвалі замак з балістрыяў і катапультаў. І ўдзень, і ўночы працягваўся падкоп пад замак. У адказ з замкавых сцен стралялі з лукаў і балістрыяў. «І біліся так шмат дзён», — сведчыць Генрых Латвійскі. Разлляваныя крыжакі на вайсковай радзе вырашылі нікога з абаронцаў замка не шкадаваць і «адпомсціць ліхадзеям на жах іншым». Нарэшце быў гатовы падкоп, і крыжакі пайшлі на штурм. Абаронцы замка адчайна адбіваліся ад ворага. Эсты адкрылі спецыяльныя адтуліны ў вале, праз якія скочвалі ўніз вогненныя колы. Але закутыя ў даспехі рыцары раскідалі агонь, збілі полымя са штурмавой вежы і ў сваю чаргу запалілі замкавую браму. Частка штурмуючых пранікла ў адтуліны ў вале і, зламаўшы супраціўленне эстаў, уварвалася ў замак. За крыжакамі на штурм кінуліся дружыны ліваў і лэтаў. Уварваўшыся ў замак, крыжакі пачалі жорсткую расправу з абаронцамі: «І адразу пачалі забіваць народ, і мужчын, і жанчын, не шкадавалі нікога, так што лічба забітых даходзіла ўжо да тысячы», — піша Генрых Латвійскі. Вячка разам з дзвюма сотнямі воінаў заняў абарону ва ўнутраных умацаваннях. Усе воіны і сам князь загінулі ў няроўным баі. Крыжакі авалодалі замкам.

Смерць Вячкі і яго ных, — яго ных вояў, аднак, не была дарэмнай: подзвіг беларускага князя натхняў рускіх і беларускіх воінаў на Чудскім возеры і ў далейшай барацьбе з Ордэнам.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Памяць

# ДА ЮБІЛЕЮ ПАРТЫЗАНСКАГА КАМАНДЗІРА

**У Віцебску адсвяткавалі 125 гадоў з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова. Ён нарадзіўся ў снежні 1891 года ў вёсцы Пуніўшча Веліжскага павета Віцебскай губерні. Гэты легендарны чалавек вядомы далёка за межамі нашай краіны як адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху Беларусі.**

— Сёлета мы святкуем дзве даты: юбілей Міная Піліпавіча Шмырова і 50 гадоў з дня ўтварэння музея. У сувязі з гэтым арганізавалі шэраг мерапрыемстваў, якія праводзілі ўперШыню. Сярод іх, напрыклад, квэст-гульні. Іх удзельнікі розных узростаў наведалі мемарыяльныя мясціны. Снежань — самы насычаны месяц на падзеі, — расказала карэспандэнту «Звязды» **дырэктар Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова Ірына ШЫШКОВА.**

У прыватнасці, нядаўна правялі «круглы стол» «Асоба ў гісторыі, праблема ўспрымання». Удзел у ім бралі прадстаўнікі музеяў, архіваў, грамадскіх арганізацый, аспіранты і студэнты гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава. Адбыўся і вечар памяці, на які запрасілі ветэранаў вайны, былых вязняў фашызму.

А завяршыла ўрачыстыя мерапрыемствы традыцыйная акцыя «Партызанская ёлка», 12-я па ліку! Падчас яе гучалі песні ваенных гадоў. Арганізавалі экскурсію ў копіі партызанскіх зямлянак.

Члены клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі аднавілі і паказалі рэальны гістарычны факт. У ноч на 23 лютага 1943 года каля 500 узброеных байцоў сфарміраванага немцамі Волга-Татарскага легіёна са зброяй перайшлі на бок партызанаў. Да гэтага яны знішчылі тры фашысцкія штабы. Легіён называўся «Ідэль-Урал». Слова «Ідэль» у перакладзе з татарскай мовы азначае «Волга».


Фота БЕЛТА.

У выніку сарвалася карная аперацыя «Шаравая маланка». У тым жа годзе амаль усе з ліку тых, хто пачаў ваяваць за Чырвоную Армію, загінулі. Пра гэта «Звязда» расказвала.

Гледачоў «Партызанскай ёлкі» частавалі гарбатай і сушкамі. Арганізавалі конкурсы, напрыклад, на самае меткае кіданне гранаты. Было шмат ахвотных сфатаграфавацца з даследчыкамі гісторыі вайны.

— Сёння вы ўбачылі прадстаўнікоў клубаў з Гомельскай вобласці. Мы неаднаразова прыязджалі ў Віцебск. Падтрымліваем сувязі з мясцовым клубам. Здымаліся ў дакументальным кіно, якое паказвалі па цэнтральных беларускіх тэлевізійных каналах. Бяром удзел у мерапрыемствах за мяжой. Напрыклад, з задавальненнем выступаем у Смаленскай вобласці — на фестывалі «Салаўёва пераправа», — адказаў на пытанні журналіста **кіраўнік гомельскага клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Памяць» Сяргей ЧУЧВАГА.**



На мерапрыемстве прысутнічалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і прадстаўнікі мясцовай улады.

— Сярод вас, бадай, няма тых, каго б не закранула вайна. Нашы продкі супрацьстаялі магутнай групоўцы вермахта, якая мела добрае ўзбраенне. І тым не менш мы перамаглі! — перад прысутнымі выступіў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ.**

Музей штогод наведваюць прадстаўнікі розных краін. За паўвекавую гісторыю тут пабывала нямала знакамітых людзей. Напрыклад, у чэрвені 1975 года з экспазіцыяй азнаёмілася Валянціна Церашкова. Яна, дарэчы, як і Шмыроў, была ўдастоена звання «Ганаровы грамадзянін горада Віцебска».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 128, 1962 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №2. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 1039, 1963 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №3. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 1066, 1965 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №4. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 1073, 1960 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №5. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 1106, 1973 г.в. стоимостью 1 298,00 рублей.<br>Лот №6. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 1398, 1965 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №7. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 2052, 1988 г.в. стоимостью 1 298,00 рублей.<br>Лот №8. Станок токарно-винторезный 1К62, инв. № 2067, 1989 г.в. стоимостью 1 514,00 рублей.<br>Лот №9. Станок токарно-револьверный 1К341, инв. № 2233, 1978 г.в. стоимостью 610,00 рублей.<br>Лот №10. Станок токарно-револьверный 1К341, инв. № 2879, 1988 г.в. стоимостью 610,00 рублей.<br>Лот №11. Станок токарно-револьверный 1К341, инв. № 3190, 1980 г.в. стоимостью 610,00 рублей.<br>Лот №12. Станок токарно-револьверный 1К341, инв. № 3191, 1980 г.в. стоимостью 610,00 рублей.<br>Лот №13. Станок плоскошлифовальный 3Б-722, инв. № 2374, 1962 г.в. стоимостью 1 433,00 рубля.<br>Лот №14. Станок плоскошлифовальный 3Б-722, инв. № 3371, 1964 г.в. стоимостью 860,00 рублей.<br>Лот №15. Станок плоскошлифовальный 3Б-722-2, инв. № 5377, 1978 г.в. стоимостью 974,00 рубля.<br>Лот №16. Станок токарно-винторезный 1К625, инв. № 1092, 1970 г.в. стоимостью 1 349,00 рублей.<br>Лот №17. Станок токарно-винторезный 1К625, инв. № 1664, 1970 г.в. стоимостью 1 349,00 рублей.<br>Лот №18. Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г, инв. № 6323, 1980 г.в. стоимостью 598,00 рублей.<br>Лот №19. Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г, инв. № 6322, 1980 г.в. стоимостью 598,00 рублей.<br>Лот №20. Станок плоскошлифовальный 3Л-722В, инв. № 6375, 1985 г.в. стоимостью 1 692,00 рубля.<br>Лот №21. Станок плоскошлифовальный 3Л-722В, инв. № 6376, 1985 г.в. стоимостью 1 692,00 рубля.<br>Лот №22. Станок плоскошлифовальный 3Е-711 В, инв. № 2265, 1980 г.в. стоимостью 2 050,00 рублей.<br>Лот №23. Станок плоскошлифовальный 3Е-711 В, инв. № 7372, 1990 г.в. стоимостью 2 050,00 рублей.<br>Лот №24. Станок токарно-револьверный с ЧПУ 1В340Ф30, инв. №2961, 1990 г.в. стоимостью 1 272,00 рубля.<br>Лот №25. Станок токарно-револьверный с ЧПУ 1В340Ф30-1, инв. №5194, 1990 г.в. стоимостью 1 272,00 рубля.<br>Лот №26. Станок токарно-револьверный с ЧПУ 1В340Ф30, инв. №5197, 1990 г.в. стоимостью 1 272,00 рубля.<br>Лот №27. Станок вертикально-фрезерный 6Р12, инв. № 4338, 1973 г.в. стоимостью 883,00 рубля.<br>Лот №28. Станок вертикально-фрезерный 6Р13, инв. № 5317, 1977 г.в. стоимостью 1 205,00 рублей.<br>Лот №29. Станок вертикально-сверлильный 2А-135, инв. № 3229, 1963 г.в. стоимостью 328,00 рублей.<br>Лот №30. Станок вертикально-сверлильный 2Н-125П, инв. № 5257, 1979 г.в. стоимостью 454,00 рубля.<br>Лот №31. Станок вертикально-сверлильный 2Н-135М, инв. № 5242, 1972 г.в. стоимостью 810,00 рублей.<br>Лот №32. Станок вертикально-сверлильный 2С-132, инв. № 8225, 1991 г.в. стоимостью 985,00 рублей.<br>Лот №33. Станок вертикально-сверлильный 2Г-125, инв. № 7258, 1990 г.в. стоимостью 547,00 рублей.<br>Лот №34. Станок вертикально-сверлильный 2А-125, инв. № 2250, 1962 г.в. стоимостью 353,00 рубля.<br>Лот №35. Станок токарно-винторезный 1К63, инв. № 1085, г.в. не определен стоимостью 2 287,00 рублей.<br>Лот №36. Станок токарно-винторезный 16Е16КП, инв. № 2864, 1988 г.в. стоимостью 1 645,00 рублей.<br>Лот №37. Станок оптический профилешлифовальный 395М, инв. № 3031, 1965 г.в. стоимостью 1 060,00 рублей.<br>Лот №38. Станок токарно-винторезный 1М63БФ1-01, инв. № 2029, 1987 г.в. стоимостью 3 797,00 рублей.<br>Лот №39. Станок внутришлифовальный 3К-228А, инв. № 7359, 1988 г.в. стоимостью 1 700,00 рублей.<br>Лот №40. Станок круглошлифовальный 3К-12, инв. № 6374, 1984 г.в. стоимостью 1 424,00 рубля.<br>Лот №41. Многоцелевой металлообрабатывающий центр с ЧПУ ИР500ПМ1Ф4, инв. № 2717, 1986 г.в. стоимостью 11 564,00 рубля.<br>Лот №42. Полуавтомат токарно-затыловочный ДН-250/III, инв. № 2141, 1977 г.в. стоимостью 1 542,00 рубля.<br>Лот №43. Станок координатно-шлифовальный MOORE 2, инв. №4382, 1970 г.в. стоимостью 3 533,00 рубля.<br>Лот №44. Полуавтомат затыловочный 1811, инв. № 1293, 1963 г.в. стоимостью 964,00 рубля.<br>Лот №45. Станок токарно-винторезный 1М63ДФ101, инв. №2013, 1983 г.в. стоимостью 2 623,00 рубля.<br>Лот №46. Станок координатно-расточной 2Б-450, инв. № 1202, 1962 г.в. стоимостью 1 927,00 рублей.<br>Лот №47. Станок круглошлифовальный 31322, инв. № 5364, 1973 г.в. стоимостью 1 156,00 рублей.<br>Лот №48. Станок для заточки протяжек 3601, инв. № 2390, 1981 г.в. стоимостью 2 142,00 рубля.<br>Лот №49. Станок фрезерный универсальный 6Н82, инв. № 3337, 1965 г.в. стоимостью 1 082,00 рубля.<br>Лот №50. Станок вертикально-фрезерный с ЧПУ 6Т12Ф20-1, инв. № 8324, 1989 г.в. стоимостью 2 499,00 рублей.<br>Лот №51. Станок вертикально-фрезерный с ЧПУ 6П3Ф3-1, инв. №7322, 1987 г.в. стоимостью 2 015,00 рублей.<br>Лот №52. Станок вертикально-фрезерный FQS, инв. № 6331, 1984 г.в. стоимостью 2 527,00 рублей.<br>Лот №53. Станок горизонтально-фрезерный 6М82Г, инв. № 2336, 1962 г.в. стоимостью 1 810,00 рублей.<br>Лот №54. Станок радиально-сверлильный 2М-554, инв. № 6246, 1985 г.в. стоимостью 2 698,00 рублей.<br>Лот №55. Станок координатно-расточной 2Д-450, инв. № 3206, 1978 г.в. стоимостью 1 491,00 рубль.<br>Лот №56. Станок фрезерно-расточной горизонтальный BFT-90-3/2, инв. № 5205, 1990 г.в. стоимостью 8 498,00 рублей.<br>Лот №57. Станок координатно-расточной 2В-440, инв. № 217, 1961 г.в. стоимостью 1 970,00 рублей.<br>Лот №58. Станок круглошлифовальный 3164А, инв. № 1357, 1961 г.в. стоимостью 1 268,00 рублей.<br>Лот №59. Станок точильно-шлифовальный 3Б-632, инв. № 2226, 1978 г.в. стоимостью 300,00 рублей.<br>Лот №60. Полуавтомат отрезной круглопильный 8Г-662, инв. № 2436, 1984 г.в. стоимостью 939,00 рублей.<br>Лот №61. Станок токарно-револьверный 1341, инв. № 2195, 1969 г.в. стоимостью 610,00 рублей.<br>Лот №62. Станок копировальный для шлифования спиральных кулачков, инв. № 583, 2005 г.в. стоимостью 2 570,00 рублей.<br>Лот №63. Станок токарно-затыловочный, инв. № 38, 1950 г.в. стоимостью 964,00 рубля.<br>Лот №64. Станок сферошлифовальный ЛЗ-98С46, инв. № 4378, 1970 г.в. стоимостью 244,00 рубля. |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ОАО «ВИСТАН» (УНП 300029332)** |
| **Наличие обременений** | **Отсутствуют** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Витебск, ул. Димитрова, 36/25 и 36/28** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **20.01.2017 в 15.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | **Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1)<br>www.vitebskjust.gov.by<br>Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 614021, 8 (033) 6879148** |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 19.01.2017 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА КУП «Гродненский завод СЖБ-10», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127

## 17 января 2017 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | Комплекс зданий, изолированных помещений, сооружений и оборудования, включающий 11 капитальных строений (производственные корпуса, административно-бытовой корпус, бетонно-смесительный узел, мотовозное депо, складские помещения, открытый склад готовой продукции, железнодорожный путь № 3, благоустройство территории), водопроводную сеть чугунную, электрическую сеть 0,4 кВ, эстакаду для разгрузки и погрузки ж/б изделий, дом-вагончик, токарный станок 16К20, кран-балка 1Б-5,П/Я-128/1, установку для нагрева воды «Эффект», кран мостовой Т-40, кран мостовой КМ-10 | Складские помещения общей площадью 11,1 м² и общей площадью 145,6 м² |
| **Начальная цена продажи** | **3 348 242,4 рублей** (с учетом НДС 20%) | **31 680 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| **Кадастровые номера земельных участков и размеры** | 440100000002006703 площадью 1,2520 га,<br>440100000002006703 площадью 1,2520 га,<br>440100000002006706, площадью 0,0133 га,<br>440100000002006704 площадью 0,8189 га,<br>440100000002006705, площадью 0,0251 га,<br>440100000002006709 площадью 0,0360 га,<br>440100000002006710 площадью 0,0146 га,<br>440100000002006714 площадью 0,1545 га,<br>440100000002006712 площадью 0,3151 га,<br>440100000002006715 площадью 0,0642 га,<br>440100000002006711, площадью 0,1863 га,<br>440100000002006713 площадью 0,3361 га,<br>440100000002006707 площадью 0,7542 га,<br>440100000002006708 площадью 0,1046 га,<br>440100000001006541 площадью 0,0069 га | 440100000001006542 площадью 0,0034 га и 440100000001006543 площадью 0,0234га |
| **Месторасположение земельных участков** | **г. Гродно, ул. Суворова, 127** | |
| **Продавец** | **Ликвидационная комиссия КУП «Гродненский завод СЖБ-10»** | |
| **Имущественное право земельных участков** | Право постоянного пользования | |
| **Сумма задатка** | 600 000 рублей | 6 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546. | |
| **Дата проведения аукциона** | **17 января 2017 года** | |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 | |
| **Место проведения аукциона** | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** | |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 | |
| **Дата и время начала приема документов** | 29 декабря 2016 года 8.00 | |
| **Дата и время окончания приема документов** | 12 января 2017 года 17.00 | |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли- продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.**

**Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru**

| Наименование объекта, нач. цена (с учетом/до деноминации), задаток (с учетом/до деноминации) |
|---|
| Лот №1. Встраиваемая электрическая поверхность ДО-620, инв. №144974, 2005 г.в. Нач. цена: 8,75/87 500 руб. без НДС. Задаток: 0,88/8 800 руб. |
| Лот №2. Кремовзбивальная машина КА-103, инв. №64163, 1984 г.в. Нач. цена: 255,15/2 551 500 руб. без НДС. Задаток: 25,52/255 200 руб. |
| Лот №3. Мармит 1-ых блюд на 2 конфорки, 2 полки, инв. №145041, 2011 г.в. Нач. цена: 147/1 470 000 руб. без НДС. Задаток: 14,70/147 000 руб. |
| Лот №4. Морозильник М-7 184-000, инв. №145044, 2011 г.в. Нач. цена: 73,50/735 000 руб. без НДС. Задаток: 7,35/73 500 руб. |
| Лот №5. Овощерезальная машина, инв. №64206, 1988 г.в. Нач. цена: 63/630 000 руб. без НДС. Задаток: 6,30/63 000 руб. |
| Лот №6. Пекарский шкаф б/у, инв. №145085, 2012 г.в. Нач. цена: 234,50/2 345 000 руб. без НДС. Задаток: 23,45/234 500 руб. |
| Лот №7. Привод универсальный, инв. №64190, 1985 г.в. Нач. цена: 80,50/805 000 руб. без НДС. Задаток: 8,05/80 500 руб. |
| Лот №8. Холодильник ХМ 1845-62 Атлант, инв. №145088, 2012 г.в. Нач. цена: 112/1 120 000 руб. без НДС. Задаток: 11,20/112 000 руб. |
| Лот №9. Холодильник ХМ-6023-031 Атлант, инв. №145087, 2012 г.в. Нач. цена: 105/1 050 000 руб. без НДС. Задаток: 10,50/105 000 руб. |
| Лот №10. Грузовой бортовой GAZ 3307, рег. знак 9901 ВТО, 1993 г.в., цвет голубой. Нач. цена: 1 265/12 650 000 руб. без НДС. Задаток: 126,50/1 265 000 руб. |
| Лот №11. Оборудование навесное снегоочистителя фрезерно-роторного ОФР-200, 2011 г.в., инв. №145035. Нач. цена: 5 126/51 260 000 руб. без НДС. Задаток: 512,60/5 126 000 руб. |
| Лот №12. Станок горизонтально-фрезерный 2М82, инв. №141202, 1982 г.в. Нач. цена: 440/4 400 000 руб. без НДС. Задаток: 44/440 000 руб. |
| Лот №13. Станок токарно-винторезный 1Е61М, инв. №141217, 1966 г.в. Нач. цена: 330/3 300 000 руб. без НДС. Задаток: 33/330 000 руб. |
| Лот №14. Машина сновальная, инв. №14301, 1967 г.в. Нач. цена: 2 200/22 000 000 руб. без НДС. Задаток: 220/2 200 000 руб. |
| Лот №15. Машина сновальная, инв. №143961, 1986 г.в. Нач. цена: 2 200/22 000 000 руб. без НДС. Задаток: 220/2 200 000 руб. |
| Лот №16. Резервуар алюминиевый емкостью 1,5 м³ (ГСМ), инв. №18571, 1971 г.в. Нач. цена: 176/1 760 000 руб. без НДС. Задаток: 17,60/176 000 руб. |
| Лот №17. Котел КПЭ СМ-60, инв. №144862, 1991 г.в. Нач. цена: 248/2 480 000 руб. без НДС. Задаток: 24,80/248 000 руб. |
| Лот №18. Машина МПУ-700 (посудомоечная), инв. №144863, 1991 г.в. Нач. цена: 390/3 900 000 руб. без НДС. Задаток: 39/390 000 руб. |
| Лот №19. Машина протирочная МП-1000, инв. №144886, 1993 г.в. Нач. цена: 176/1 760 000 руб. без НДС. Задаток: 17,60/176 000 руб. |
| Лот №20. Устройство варочное (общепит.) марки УЭВ 60.000.000РЭ, инв. №144871, 1991 г.в. Нач. цена: 84/840 000 руб. без НДС. Задаток: 8,40/84 000 руб. |
| Лот №21. Увлажнитель воздуха АГ-1, инв. №145019, 2010 г.в. Нач. цена: 77,50/775 000 руб. ез НДС. Задаток: 7,75/77 500 руб. |
| Лот №22. Воздухосборник 4 м куб., инв. №144867, 2013 г.в. Нач. цена: 150/1 500 000 руб. без НДС. Задаток: 15/150 000 руб. |
| Лот №23. Воздухосборник 4 м куб., инв. №144869, 2013 г.в. Нач. цена: 150/1 500 000 руб. без НДС. Задаток: 15/150 000 руб. |
| Лот №24. Воздухосборник 4 м куб., инв. №144868, 1992 г.в. Нач. цена: 150/1 500 000 руб. без НДС. Задаток: 15/150 000 руб. |
| Лот №25. Машина сновальная Текстима 4125, инв. №14300, 1967 г.в. Нач. цена: 875/8 750 000 руб. без НДС. Задаток: 87,50/875 000 руб. |
| Лот №26. Молот кованый пневматический марки МБ-412, инв. №141220, 1966 г.в. Нач. цена: 397,50/3 975 000 руб. без НДС. Задаток: 39,75/397 500 руб. |
| Лот №27. Станок вертикально-сверлильный марки 2Н125Л, инв. №143048, 1976 г.в. Нач. цена: 152/1 520 000 руб. без НДС. Задаток: 15,20/152 000 руб. |
| Лот №28. Станок зубофрезерный марки 5310, инв. №141196, 1964 г.в. Нач. цена: 428/4 280 000 руб. без НДС. Задаток: 42,80/428 000 руб. |
| Лот №29. Станок круглопильный Ц-5, инв. №141200, 1964 г.в. Нач. цена: 108/1 080 000 руб. без НДС. Задаток: 10,80/108 000 руб. |
| Лот №30. Станок круглошлифовальный марки 3А151, инв. №141219, 1967 г.в. Нач. цена: 464/4 640 000 руб. без НДС. Задаток: 46,40/464 000 руб. |
| Лот №31. Станок плоско-шлифовальный марки 3Д711ВФ11, инв. №144334, 1991 г.в. Нач. цена: 5 720/57 200 000 руб. без НДС. Задаток: 572/5 720 000 руб. |
| Лот №32. Станок рейсмусовый СР-8 марки СР-8, инв. №143359, 1978 г.в. Нач. цена: 876/8 760 000 руб. без НДС. Задаток: 87,60/876 000 руб. |
| Лот №33. Станок деревообрабатывающий УС-2М, инв. №141199, 1965 г.в. Нач. цена: 207,50/2 075 000 руб. без НДС. Задаток: 20,75/207 500 руб. |
| Лот №34. Таль электрическая 0,5 т марки CD 0,5 т, в/п 6 м, инв. №144881, 2013 г.в. Нач. цена: 168/1 680 000 руб. без НДС. Задаток: 16,80/168 000 руб. |
| Лот №35. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141363, 1967 г.в. Нач. цена: 960/9 600 000 руб. без НДС. Задаток: 96/960 000 руб. |
| Лот №36. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141364, 1967 г.в. Нач. цена: 960/9 600 000 руб. без НДС. Задаток: 96/960 000 руб. |
| Лот №37. Емкость стальная 2,5 м куб., инв. №181343, 1987 г.в. Нач. цена: 54/540 000 руб. без НДС. Задаток: 5,40/54 000 руб. |
| Лот №38. Емкость стальная 2,5 м куб., инв. №181344, 1986 г.в. Нач. цена: 54/540 000 руб. без НДС. Задаток: 5,40/54 000 руб. |
| Лот №39. Капитальное строение с инв. №200/С-82204 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 66, корп. 1, площадью 380,7 кв.м, наименование: здание компрессорной, назначение: здание специализированное энергетики; дорога на промплощадке площадью 95 кв.м, инв. №12007; забор кирпичный на кирпичных столбах протяженностью 140 м п., высотой 3,3 м с воротами металлическими автомобильными дл. 6 м инв. №12038; мостовой кран 5 т., инв. №142263-1. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №240100000003004246 площадью 0,3481 га. Нач. цена: 54 910/549 100 000 руб. без НДС. Задаток: 5 491/54 910 000 руб. |
| Лот №40. Комплексная трансформаторная подстанция КТП-250/04, инв. №143378, 1979 г.в. Нач. цена: 1 440/14 400 000 руб. без НДС. Задаток: 144/1 440 000 руб. |
| Лот №41. Насос 80-65-160, инв. №144419, 1991 г.в. (без двигателя). Нач. цена: 315/3 150 000 руб. без НДС. Задаток: 31,50/315 000 руб. |
| Лот №42. Насос 80-65-160, инв. №144420, 1991 г.в. Нач. цена: 486/4 860 000 руб. без НДС. Задаток: 48,60/486 000 руб. |
| Лот №43. Станок токарно-винторезный, инв. №144234, 1989 г.в. Нач. цена: 450/4 500 000 руб. без НДС. Задаток: 45/450 000 руб. |
| Лот №44. Копировальный аппарат XEROX, инв. № 144498, 2007 г.в. Нач. цена: 171/1 710 000 руб. без НДС. Задаток: 17,10/171 000 руб. |
| Лот №45. Шкаф ШДК -5907 (станция), инв. № 144963, 2005 г.в. Нач. цена: 1 980/19 800 000 руб. без НДС. Задаток: 198/1 980 000 руб. |
| Повторные торги состоятся **12.01.2017 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с **27.12.2016 с 8.30 по 11.01.2017 до 17.30.** Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Объекты находятся по адресу: лоты №№1–44 – г. Витебск, ул. М. Горького, 62, лот №№45 – г. Витебск, пр-т Победы, 7. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, комиссия по конвертации и переводу валюты, демонтаж оборудования осуществляется за счет покупателя. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 07.12.2016, 09.11.2016. |

| Наименование объекта, нач. цена (с учетом/до деноминации), задаток (с учетом/до деноминации) |
|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-96658 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 62-1, площадью 15077,3 кв.м, назначение – производственное помещение, наименование – Ткацкий цех №1, (инв. №11012), Капитальное строение с инв. №200/С-97005, тепловая сеть к зданию №62, протяженность 68,1 м; Капитальное строение с инв. №200/С-97007, паропровод к зданию №62, протяженность 29 м; Капитальное строение с инв. №200/С-97014, канализационная сеть бытовая от здания №62, протяженность 123 м; Капитальное строение с инв. №200/С-97006, водопроводная сеть технической воды к зданию №62, протяженность 69,8 м; Капитальное строение с инв. №200/С-97013, канализационная сеть ливневая от здания №62, протяженность 118,7 м; Озеленительные насаждения, инв. № 144995, год ввода 2006; Виноград девичий 4 шт., инв. № 144508, год ввода 2007; Дорожное покрытие, инв. №12080, год ввода 2010; Лифт грузовой ПГ-286, инв. №11011, год выпуска (ввода) 1991; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. № 141362, год выпуска (ввода) 1967; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. №141330, год выпуска (ввода) 1966; Трансформатор силовой ТМ-1000, инв. № 141364, год выпуска (ввода) 1967; Бак воды 125М3, инв. № 18664, год выпуска (ввода) 1965; Турникет-трипот Т-025 R, инв. № 144513, год выпуска (ввода) 2009; Щит управления, инв. №144373, год выпуска (ввода) 1991; Щит управления, инв. №144370, год выпуска (ввода) 1991; Щит управления, инв. №144371, год выпуска (ввода) 1991; Кран мостовой 5 т в составе: опоры металлические 10 штук высотой 12 м, кран-балка опорная с длиной пролета 15м грузоподъемностью 5 тонн, тельфер грузоподъемностью 5 т высотой подъема 12 м, инв. №143362, год выпуска (ввода) 1979. Капитальное строение с инв. №200/С-87185 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 62/1, назначение – сооружение специализированное электроэнергетики, наименование – сооружение трансформаторной подстанции площадью 183,3 кв.м, составные части 2 линии электропередачи в т.ч. 5 единиц кабельных линий: Кабель ААБ 3*150 протяженностью 1420 м, инв. №15196, Кабель ААБ 3*150 протяженностью 1420 м, инв. №15197, Кабель ААБ 3*185 протяженностью 1420 м, инв. №15211, Кабель ААБ 3*150 протяженностью 2230 м, инв. №15198, Кабель ААБ 3*150 протяженностью 2230 м, инв. №15199. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №240100000003009640 площадью 1,9676 га (долевая аренда). Нач. цена: 2 557 138,22/25 571 382 200 руб. без НДС. Задаток: 255 713,83/2 557 138 300 руб. |
| Торги состоятся **27.01.2017 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 27.12.2016 с 8.30 по 26.01.2017 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62, лот №47 – г. Витебск, пр-т Победы, 7. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, комиссия по конвертации и переводу валюты, демонтаж оборудования осуществляется за счет покупателя; обеспечение потребителей электрической энергии (в т.ч. абонентов и субабонентов) электрической энергией с заключением договоров энергоснабжения, а также иных условий и норм в соответствии с действующими в РБ правилами энергоснабжения. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 09.11.2016. |

**Задаток перечисляется на р/с: №3012411521014 (руб.), №3012411521812 (RUB), №3012411521519 (USD), №3012411521522 (EUR) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

■ Равеснікі «Звязды»

# 100-гадовы масквіч дапамагае Полацку

**Ветэран Вялікай Айчыннай вайны з Масквы, якому нядаўна споўнілася 100 гадоў, не страчвае сувязі з Беларуссю, дзе ваяваў. Па распараджэнні кіраўніцтва райвыканкама ён удастоены знака «За заслугі перад Полацкам». Нядаўна члены афіцыйнай дэлегацыі ўручылі яго ветэрану.**

Міхаіл Якаўлевіч Скрабін па нараджэнні — астраханец, па месцы жыхарства — масквіч. Але, як ён гаворыць, у «душы» — палачанін! Нягледзячы на ўзрост, дапамагае ў будаўніцтве ў Полацку Мемарыяльнага комплексу памяці ахвяр фашызму «Урочышча Пяскі». Гэты праект падтрымала цыклам публікацый газета «Звязда». Франтавік знаходзіць спонсараў сярод расійскіх ветэранскіх арганізацый.

Дарэчы, у якасці фатографа ён прымаў удзел у стварэнні вядомых фільмаў: «Залатыя ключык», «Паднятая цаліна», «Два байцы», «Ленін у кастрычніку» і іншых.

Нарадзіўся М. Я. Скрабін 21 лістапада 1916 г. у сям'і рыбака. Ужо на другі дзень вайны добраахвотна пайшоў на фронт. Быў залічаны байцом 25-га кулямётнага батальёна Полацкага ўмацаванага раёна. Параненым трапіў у палон. У лістападзе 1941-га апынуўся ў полацкім перасыльным лагеры. Затым быў у лагеры ў ваенным гарадку Баравуха-1. Стаў членам падпольнай арганізацыі і ўцёк з нявол. Партызанская сувязная пераправіла ўцекачоў у партызанскую брыгаду «Няўлоўныя». І для Скрабіна пачаўся новы этап барацьбы з захопнікамі.



На рахунку яго разведвальна-дыверсійнай групы 6 падарваных варожых эшалонаў. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў званні старшыны разведвальнага батальёна адной са стралковых дывізій 5-й арміі з баямі дайшоў да Кёнігзберга.

Пасля разгрому прускай групоўкі ворага яго дывізія была перакінутая на Далёкі Усход. Напярэдадні яго чакалі ўпартыя баі з японскімі самураямі.

За гады вайны Міхаіл Якаўлевіч быў тройчы паранены і кантужаны. Ён — кавалер пяці ордэнаў і шматлікіх медалёў, у тым ліку «За адвагу».

У Маскве фактычна выконвае «абавязкі пасла зямлі полацкай». Расказвае пра самы старажытны беларускі горад, выдатных людзей, іх дасягненні. Шануе беларусаў за тое, што яны з павагай адносяцца да мінулага.

На працягу апошніх пяцідзесяці гадоў кожны год прыязджаў у Полацк. І пра яго «Звязда» не аднойчы расказвала.

— У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з мясцовымі жыхарамі абараняў гэты рэгіён ад захопнікаў. Мы, славяне, заўсёды плячо да пляча. У адзінстве наша сіла, залог развіцця і росквіту нашых краін. Гэта адзінства і гэтая дружба дапамаглі нам у гады Вялікай Айчыннай. Ваша зямля акраплена крывёй савецкіх людзей: салдат, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Захоўвайце памяць пра іх! — звяртаецца ветэран да жыхароў Беларусі.

Я нізка кланяюся ў ногі ўсім тым, хто падняў з нябыту гісторыю ўрочышча Пяскі. Нераўнадушным энтузіястам, прадстаўнікам улады, хто займаецца стварэннем мемарыяла на гэтым святым месцы. Урочышча можна назваць масавай брацкай магілай, тут супакоены бязвінныя людзі... Колькі буду жыць, паспрабую дапамагаць ва ўвекавечанні іх памяці...

Ён у чарговы раз прызнаўся ў любові да Беларусі. Пажадаў напярэдадні калядных і навагодніх свят пераадолення ўсіх цяжкасцяў.

У сваю чаргу хочацца пажадаць яму моцнага здароўя і даўгалецця.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

***P.S.** Аўтар дзякуе за падрыхтоўку артыкула прэсслужбе Полацкага райвыканкама, супрацоўнікам музея баявой славы Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*

■

■ Факт

## Музей знакамітага дыпламата

### адкрыўся ў школе, якая носіць яго імя

**У Пярэжырскай сярэдняй школе Пухавіцкага раёна, якая носіць імя былога міністра замежных спраў БССР Анатоля Гурыновіча, адкрылі музей славутага земляка. Мерапрыемства прымеркавалі да 150-годдзя ўстановы адукацыі.**

У школе нямала выпускнікоў, якімі тут ганарацца. Але імя Анатоля Емяльянавіча стаіць крыху асобна. І не толькі таму, што ён шмат зрабіў для нашай краіны. У школе на пасадзе дырэктара 20 гадоў працавала яго маці Васіліса Васільеўна, якой прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР». У гады вайны яна была членам партызанскага спецатрада Градава. Жанчына ўзнагароджана ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. На святкаванні юбілею школы прысутнічалі яе вучні, якія з павагай і цеплынёй успаміналі сваю настаўніцу.

На цяперашні час гэта самы сучасны школьны музей у раёне. Створаны ён па ініцыятыве Міністэрства замежных спраў Беларусі. У яго аздабленні выкарыстаны «фірменныя» колеры гэтага ведамства: сіні, шэры і сталёвы. Канцэпцыю афармлення распрацавала метадыстка Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Наталля Обухава. У экспазіцыю Наталля Іванаўна ўключыла і фотаздымак будынка Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. На гэтай пляцоўцы былыя і цяперашнія дыпламаты адстойвалі і адстойваюць пазіцыі Беларусі ў міжнароднай палітыцы.

Інфармацыя на стэндах скампанавана такім чынам, каб каля кожнага з іх можна было правесці цэлы ўрок або класную гадзіну. Экспанаты змяшчаюцца і ў шкляных вітрынах, каб у экспазіцыю было зручна ўносіць змены. У зале ўладкаваны дзве трыбуны і плошча раздзелена на дзве паловы. У адной можна весці размову пра асабістае жыццё Анатоля Гурыновіча. У другой — пра гісторыю беларускай дыпламатыі.

Пры падтрымцы райвыканкама зроблены рамонт. І цяпер сельская ўстанова адукацыі як вонкава, так і па ўнутраным афармленні не саступае гарадскім.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## Японскі ўрад — мінскаму анкадыспансеру

**80 тысяч долараў атрымае ў якасці гранта Мінскі гарадскі клінічны анкалагічны дыспансер на куплю ўльтрагукавога сканера, што стане магчымым дзякуючы праграме японскага ўрада «Карані травы» — грантавая дапамога для праектаў па гарантаванні бяспекі чалавека».**

Праграма скіравана на выдзяленне абсталявання для задавальнення базавых патрэб чалавека — патрэбы ў ежы, жыллі, адукацыі, медыцынскай абароне і іншых жыццёва неабходных рэчах. У Беларусі праекты «Каранёў» рэалізуюцца ў галіне ахоны здароўя, адукацыі, сельскай гаспадаркі з 2004 года. З таго моманту былі падпісаны кантракты па 36 праектах на агульную суму амаль 3 млн долараў. Чарговая фінансавая падтрымка будзе аказана паводле праекта па ўдасканаленні медыцынскага абсталявання ў Мінскім гарадскім клінічным анкалагічным дыспансеры. Гэта будзе першы рэалізаваны ў сталіцы праект японскай праграмы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■

**Юлія Алейчанка нарадзілася ў Оршы. Скончыла філалагічны факультэт БДУ, потым магістратуру там жа, цяпер вучыцца ў аспірантуры. Працуе адказным сакратаром часопіса «Полымя». Піша вершы, апавяданні, крытычныя артыкулы, перакладае. Захапляецца жывапісам, музыкай ды міфалогіяй. Любіць трапляць у «памежнае становішча», падарожнічаць і спрачацца з цікавымі людзьмі. Не страчвае надзею стаць такой, як хацелася ў дзяцінстве.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Алесь БАДАК.**

**Юлія АЛЕЙЧАНКА**

# БОЛЕЙ НЕ БУДУ!

СЁННЯ ноччу, упершыню за апошнія гадоў пяць, Лізе прыснілася прабабуля. Цёплы асенні поўдзень... Баба Валя, як называла яе яшчэ Лізіна маці, шпарка крочыць па сцяжынцы насустрач, вясёлая і адначасова засяроджаная, у сваім звычайным для будняга дня баваўняным карычневым касцюме. Вось толькі выглядае далёка не на восемдзесят гадоў. Яна — прыгожая маладжавая кабета. Густыя чорныя валасы прыбраны ў высокую акуратную прычоску па модзе сямідзясятых, позірк спакойны і ўпэўнены, вочы свецяцца няўлоўнай шчырасцю і сарамлівасцю. Потым ужо, зранку, аналізуючы сон, Ліза прыгадала, што менавіта так выглядае прабабуля на невялікім чорна-белым здымку, уклееным у яе дзіцячую ружовенькую анкету для сяброўак. Памятаеце, былі такія кніжачкі з пытаннямі пра мары, хобі, любімы музычны гурт і фільм? Дык вось, Ліза дала запоўніць такую анкету не толькі сяброўкам і аднакласніцам, але і сям'і: маме, тату, дзядулю, бабулі ды прабабулі. Баба Валя адказала на ўсе пытанні з уласцівай ёй сур'ёзнасцю, напісала ўнучцы шмат добрых пажаданняў, доўга думала, які фотаздымак прымацаваць. І знайшла для анкеты гэты... Пэўна, наўмысна: каб у памяці Лізы застацца такой прыгожай. Знешнасці прабабуля надавала шмат увагі. Выдатна разумеючы, што яна прыгажуня (у дзень яе вяселля назойлівыя кавалеры нават беглі са стрэльбай за сваточным картэжам), амаль да пенсіі хадзіла ў групу гімнастыкі пры спорткомплексе, старалася з простай рэчы зрабіць нешта арыгінальнае, таму шмат грошай на суменкі-кофтачкі ніколі не трэціла. І Лізе заўсёды шчыра казала, што добра было б папрацаваць, калі тая стала хударлявай дзяўчынкай-падлеткам. Вакол таксама любіла прыгажосць. Чароўныя пейзажы, копіі вядомых карцін (у памяці Лізы і «Ранак у сасновым бары», і «Паляўнічыя на прывале»), старыя іконы віселі на сценах яе кватэры. А якія дываны, посцілкі рабіла сама баба Валя! І гэта ўсё пры тым, што фальшывага культу ўзвышанага ў прабабулі не было ніколі. Кожнае лета яна жыла ў вясковым доме, працавала на зямлі, не баючыся ніякіх вялікіх і маленькіх цяжкасцяў. Колькі разоў расказвала, як забіла змяю, як спраўджвала з хаты цыган... Пра вайну, якую сустрэла дзесяцігадовай дзяўчынкай, таксама не казала пафасных слоў, што так любяць гаварыць народжаныя пасля... Баба Валя цікавілася ўсім новым, ведала, што адбываецца ў свеце. З ёй было проста, і розніца ў пакаленнях адчувалася, бадай што, толькі пры поглядзе на буфет прабабулі з нязменнай чырвонай вазай...

Калі ў каляровым сне прабабуля апынулася побач, то яны доўга размаўлялі пра нешта штодзённае, нязначнае, быццам бы і не развіталіся ніколі... Пра што — Ліза, хоць забі, так і не ўспомніла. А вось пасля, шчымліва дакрануўшыся да рукі, баба Валя ціха папрасіла: «Не рабі так болей». Гэта, галоўнае, і ўрэзалася ў памяць. Чаго не рабіць — пытанне не паўставала. Калі цябе ўшчувае блізкі чалавек — заўсёды разумееш з якой нагоды. Гэта тое, з-за чаго вінаваціш сам сябе даўно, з болем тупым, працяглым. Пераглядаючы доўгі шэраг апошніх дзён, Ліза не можа дараваць сабе непатрэбных кампрамісаў, дзяжурных ўсмешкі, няшчырасць, здраду... Прабабуля хоча, каб яна засталася той, якую бачыла ў апошні раз. Той, якая здольная была захапляцца першым снегам і гульнёй вечаровага святла ў лужынах, не спаць начамі з пэндзлем ці алоўкам у руках, марыць стаць лепшай, чым учора. Той, якая не баіцца выказаць праўду, заказаць ў недасяжнага, даведацца невядомае. Ці выдатна — ці ніяк. У яе ж моцны характар, яна ўпартая, часам і занадта. А баба Валя любіць такіх, непакорлівых...

ЯНА і сама была такая. Некаму падавалася нават грубаватай. Ліза добра памятае той летні час, калі яна, дзяўчынка-сямікласніца, раптоўна, нечакана трапіла ў рэанімацыю. Невядома чаго (ну, гойсала з турніка, як усе дзецi), адкрыўся ўнутраны крывацёк. Вядома, ні сама Ліза, ні яе бацькі не зразумелі адразу, чаму так моцна ў яе баліць жывот. Ды і расказала не адразу: зноў жа — характар, цярплівая. Аперацыю рабілі, калі адлік часу ўжо ішоў на хвіліны. Дзякуй богу, выратавалі. Калі перавялі з рэанімацыі ў звычайную палату, усе сваякі баяліся дыхнуць на яе — такое перажыла. А баба Валя не ўздыхала гаротна, не плакала над ложкам (хоць дома, відавочна, не спала начэй — выдавалі вочы), а бадзёра расказвала пра надвор'е, пра «Славянскі базар», пра агарод... Бацькі потым скардзіліся: «Яна што, не перажывае?» А прабабуля перажывала гора, радавалася папраўцы, але выдатна ведала, пра што трэба гаварыць з хворымі.

Аб тым, што баба Валя памерла, Ліза даведалася толькі праз некалькі дзён. У тэлефонным размове бацькі не сказалі: не хацелі так моцна хваляваць дачку-першакурсніцу. Вельмі дзіўна — чаму яны зрабілі так... Ліза ж з-за гэтага не была на пахаванні прабабулі. Калі прыехала на выхадныя ў родны горад са сталіцы, пабачыла на пероне свайго хлопца і бацькоў. Яны падбеглі, неяк няёмка прывіталіся і паведамілі, што бабулі Валі ўжо няма... Калі Ліза вярталася з вакзала з Сяргеем, праплакала ўсю дарогу... І дома, слухаючы потым сваіх любімых «Бі-2», таксама не магла стрымаць слёзы. Бацькі ж палічылі музыку за знявагу, таксама не зразумелі. А Лізе проста нечым трэба было запоўніць думкі...

Першы раз прабабуля прыснілася ёй, дваццацігадовай, калі трэба было рабіць лёсавызначальны выбар. Але тады ў сне баба Валя стаяла на балконе і праз шкло не чуваць было, што яна кажа. Але Ліза і так зразумела... Потым пяць гадоў маўчання — і цяпер ужо пачутыя, пэўныя словы. У такія напярэджанні родных пачынаюць верыць нават тыя скептыкі, што смяюцца са святла ў канцы тунэля, знакаў у паўсядзённым жыцці, з падказак лёсу...

ЛІЗА прачынаецца ў шэрым млявым святле снежаньскага ранку, ступае босымі нагамі па мяккім ворсе бялюткага дывана, па халодным паверхні лінолеуму. Ставіць моцную каву. Седзячы пры стале, піша тлустым маркерам на вялікім лісце паперы «Болей не буду!» і прыклейвае скотчам да акна, надпісам на вуліцу. Смяецца сама са свайго дзіцячага ўчынку. Але, яшчэ добра не прачнуўшы, упэўнена, што так баба Валя абавязкова пабачыць адказ. Усё зразумее і прабачыць.

Я ведаю, што ты ўсё бачыш. Я помню і люблю.

# «Зімовая кватэра» для шымпанзэ

## Як жывёлы Мінскага заапарка спраўляюцца з халадэчай

**Дзе мядзведзь Трыстан згубіў Ізольду? Хто лічыцца анёлам-ахоўнікам Мінскага заапарка? Навошта алень прасоўвае рогі праз вальеру? На гэтыя пытанні і не толькі дапамагла знайсці адказы малодшы навуковы супрацоўнік заапарка Алена БАДРОВА.**



Малодшы навуковы супрацоўнік заапарка Алена БАДРОВА праводзіць экскурсію па сваёй гаспадарцы.

Фота Антаніны ХАТЭНКІ.

### СПАЧАТКУ БЫЎ ХАН

У гэтым годзе Мінскаму заапарку споўнілася 32 гады. Гэта дастаткова малады ўзрост для такой «звярынай» установы. Маскоўскаму заапарку, напрыклад, 152 гады, Лонданскаму — каля 200. Мінскі заапарк ганарыцца багатай разнастайнасцю жывёл — 500 відаў «У Маскоўскім налічваецца 2000, — згадвае Алена Бадрова. — Гэта значыць, што мы за 30 гадоў дасягнулі чвэрці іх відавога складу».

Пачыналася гісторыя айчыннага заапарка ў савецкі час. Першапачаткова звярынец планаваўся як заакутох МАЗа, а будавалі яго камсамольцы аўтамабільнага завода. Першыя жыхары «звярынага прытулку» — вярблюд па прозвішчы Хан і зубраня Гай. Дарэчы, вярблюда падарыла расійская дрэсіроўшчыца Тэрэза Дурава. Сёння заапарк умоўна падзяляецца на старую тэрыторыю і новую.

### ЗІМОЎКА ПТУШЫНЫХ

Пакуль падыходзім да клетак з птушкамі, Алена Ільінічна расказвае пра сябе: «Скончыла біялагічны факультэт БДУ, працавала ў школе. Апошнія сем гадоў — тут у заапарку. Мне падабаецца, ужо цяжка ўявіць жыццё без жывёл».

Сярод драпежных птушак у асноўным айчынныя прадстаўнікі. Сустрэліся ўнікальныя расійскія белаплечыя арланы, якіх у прыродзе ўбачыць немагчыма. Калі яны трапяць на вока чалавеку, то адразу пакідаюць гнёзды.



Інтэлект шымпанзэ Нюры дасягае ўзроўню 3-гадовага дзіцяці.

Шукаючы месца для птушыных, супрацоўнікі ўлічвалі беларускую спецыфіку: птушкі селяцца каля вады. Яны ўсе добра пераносяць зіму, таму што цеплакроўныя. Іх жыццё ўзімку напрамую залежыць ад корму: калі ежы дастаткова — птушкі адчуваюць сябе выдатна.

— Вушастыя совы, ці нясыць, звычайна лёгка пераязываюць маразы. Паглядзіце, якія яны сімпатычныя, — паказвае Алена Ільінічна на пяць калмацэнькіх і лупатых совак, якія размясціліся ў парадку змяншэння памераў. — Нам гэтых прыгажуноў яшчэ птушанятамі прынеслі. Совы харчуюцца свежазабітымі грызунамі. У нас іх спецыяльна разводзяць для корму драпежным птушкам. Калі соўкам не даць цёпленькую мышку — яны могуць загінуць.

А вось гусакоў і лебедзяў прыходзіцца пераводзіць узімку ў цёплыя памяшканні. Тая ж справа з экзатычнымі птушкамі — марабу, жураўлямі. Яны ў прыродзе харчуюцца жабкамі і яшчаркамі. Узімку іх знайсці немагчыма, таму на дапамогу прыходзіць чалавек.

— Нам даволі часта тэлефануюць з просьбай: «Забярыце вашага бусла». Па-першае, гэта не нашы буслы, — тлумачыць Алена Бадрова. — Па-другое, у нас сваіх пяць галоў, якіх мы прыкормліваем. Канешне, у звычайных умовах яны адлятаюць, але калі людзі пачынаюць карміць, то парушаецца натуральны баланс і яны могуць застацца.

Вядучы заатэхнік Аляўціна Цімашкова-Красоўская захапляецца буслам, які сядзіць на ўзвышшы над заапаркам і чакае бусліху: «Ён так можа ўсю зіму прасядзець. Гэта сімвал нашага заапарка, анёл-ахоўнік. Сядзіць там і толькі час ад часу крумкачоў адганяе».

### БЯРЛОГА БУРАГА

— У нашага Трыстана (так клічуць адзінага ў Мінскім заапарку мядзведзя) хутка дзень нараджэння. 7 студзеня будзем адзначаць, — усміхаецца Алена Ільінічна. — Калісьці ў яго была Ізольда, але тэрмін жыцця мае межы як у чалавека, так і ў жывёлы... Нашаму «бурыку» ўжо больш за 10 гадоў.

Вядома, што арганізм мядзведзя загадзя запраграмаваны на зімовы сон. Да гэтага ён рыхтуецца яшчэ з лета. Калі беларускі мядзведзь важыць каля 700 кілаграмаў, то 200 з іх — тлушч, які ён нагульвае за лета. Калі мы падышлі да вальеры, Трыстан спаў.

— Восенню Трыстан робіцца млявым, потым наогул засынае (калі тэмпература падае да -3 — -10 градусаў). Сон у нашага «хлопца» насцярожаны, таму што побач траса, людзі і іншыя жывёлы ўвесь час замініюць. Калі-нікалі можа прачнуцца: выйдзе сам або лапу высуне ці морду. Падымаецца ён дзесьці ў сакавіку.

### ХТО АПРАНУЎСЯ Ў ГУСТЫ ПАДШЭРСТАК

Калматыя жыхары заапарка, якія належаць да цеплакроўных млекакормячых, грунтоўна падрыхтаваліся да зімы — абраслі шчыльнай цёплай поўсцю. У такім футры ім ніякія маразы не страшныя. У вулічных вальерах засталіся на зімоўку вярблюды, тыгры, ягуары, ільвы, леапарды, рысі, зубры, ваўкі, лісіцы і іншыя жывёлы.

— Сквошык, добрая кісуля, прыгожы коцік, — падзывае Алена Ільінічна ганарлівую рысь з кароценькім хвосцікам, бакенбардамі на мысе і «пэндзлікамі» на вушах. — Гэта малады самец. Наогул усе кашачыя выдатна пераносяць нізкія тэмпературы. У прыродзе яны могуць жыць як на раўнінах, так і ў гарах. Вясной пачнецца лінька. Наш Сквошык не толькі любіць снежныя ванны, яшчэ і мурлыкае прыемна, калі ў добрым настроі.

Прайшліся каля клетак з бенгальскімі тыграмі. Зара і Вара, дзве самкі 2-гадовага ўзросту, гарэзавалі адна з адной. У суседняй вальеры мірна спаў дарослы тыгр Сайман. А вось каракал (у перакладзе з турэцкай — чорнае вуха), якога яшчэ называюць пустынны кошкай, быў настроены па-таварыску і з задавальненнем пазіраваў на камеру. Пад падсцілку для калматых драпежнікаў выкарыстоўваюць апілкі, часам сена.

— Да нас зусім нядаўна прыехалі з Арменіі белыя львы. Гэта адчынены памяшканне, яны могуць і на вуліцу выходзіць, і ва ўнутраных цёплых доміках паляжаць. У іх там ёсць батарэя. З Масквы прывезлі не так даўно чатырох шрубарогіх казлікаў. У іх такія незвычайныя гарызантальныя зрэнкі, паглядзіце...

У суседняй вальеры неўзабаве пачулася гучнае скрыганне. Гэта алень зачапіўся шыкоўнымі рагамі за агароджу. Бедалага пазіраў на нас жаласнымі вачамі і імкнуўся вызваліцца з жалезнага палону. Неўзабаве на дапамогу жывёле падаспела Аляўціна Генадзеўна. Яна адной рукою ўзялася за краты, а другой накіравала рогі ў другі бок. «Гэта ён так прыцягвае да сябе ўвагу, — тлумачыць вядучы заатэхнік. — Гэта наш гарэза, яму сумна аднаму. Насамрэч алені адзін раз на год узімку скідваюць рогі».

Вярблюды, якіх у заапарку аказалася аж два, таксама выдатна перажываюць маразы. Яны прыехалі з Сярэдняй Азіі, дзе дастаткова халодныя зімы.

— Каб людзям захварэць, неабходна пераахаладжэнне, недаданне і недасыпанне. Напэўна, так і з жывёламі, — тлумачыць Алена Ільінічна. — У заапарку ім цёпла, ды і кормяць добра. Канешне, здараюцца вірусныя захворванні, але ветэрынарная служба ў складзе двух спецыялістаў дапамагае.

Дарэчы, зусім не баяцца холаду вавёркі, куніцы і тхары. Іх спецыяльна размяшчаюць на зіму ў вулічныя вальеры, і яны выдатна сябе пачуваюць. Летам на іх месцах знаходзіцца экзатычныя рэдкія жывёлы, якія пры нізкіх тэмпературах не выжываюць.

### ДЗЕ ХАВАЮЦЦА «ЭКЗОТЫ»?

Найбольш цяжкім выпрабаваннем зіма становіцца для экзатычных жывёл. Аднак у Мінскім заапарку яны не адчуваюць тэмпературных нязручнасцяў, бо яны знаходзяцца за шклом, дзе тэмпература каля +20 градусаў.

— Цёплыя памяшканні ў нас ёсць заўсёды. Праўда, гэта не тое, што кватэра ў чалавека: атрымаў — і на ўсё жыццё. Звяркоў звычайна перамяшчаюць з аднаго месца ў другое.

Самыя цеплалюбівыя жывёлы ў Мінскім заапарку — малпы. Іх пераводзяць на зіму з вуліцы ва ўцепленыя спецпамяшканні. Чарнявы шымпанзэ дэманстратыўна ўзяў банан, ачысціў яго ад лупіны і пачаў прагна грызці.

— Гэта Нюра і Даша, — паэнаёміла нас з сімпатычнымі малпамі. — Нюры ўжо больш за 10 гадоў, яе нам з цырка перадалі, калісьці яна на сцэне выступала. Дарэчы, шымпанзэ жывуць да 60 гадоў, а на арэну можна выходзіць толькі з малымі. Калі жывёла вырастае, то робіцца агрэсіўнай. Нюра раней жыла дома ў дрэсіроўшчыкаў, інтэлект яе дасягае ўзроўню 3-гадовага дзіцяці. Малпачка сама п'е з бутэлькі, накрываецца, калі спіць, фарбуе вусны, нават вокны можа мыць.

Для цеплалюбівых жывёл на тэрыторыі заапарка пабудаваныя экзатарыум і тэрарыум. Супрацоўнікі збіралі вопыт па лепшых заапарках свету і ажыццявілі ўнікальныя задумкі ў нас. Экзатарыум уяўляе сабой павільён для жывёл Паўднёвай Амерыкі. Тут знайшлі прытулак 80 відаў жывёл і 20 відаў раслін.

— Амерыканскія малпы вельмі маленькія, іх нельга параўноўваць з афрыканскімі шымпанзэ, — працягвае экскурсію па сваёй гаспадарцы Алена Ільінічна. — А паглядзіце на бурага тамарына з белымі вусікамі. Ён да нас з Чэхіі прыехаў. А гэта чырванавухія чарапахі, яны ў нас у вольным плаванні.



Калмаценькіх і лупатых совак прынеслі ў заапарк яшчэ птушанятамі.

А ці бачылі вы маленькіх кракадзілаў? Яны падобныя да нерухомых яшчарак. Цяжка паверыць у тое, што з'явіліся на свет яны ў заапарку. Кракадзілы рэдка размнажаюцца ў ненатуральных умовах. Самка адклала 32 яйкі, з якіх вылупіліся тры маленькія кракадзільчыкі.

У рэптылій тэмпература тулава залежыць ад тэмпературы навакольнага асяроддзя. У прыродзе на зіму яны засынаюць. Тэрарыумныя ўмовы дазваляюць чарапахам, змеям і яшчаркам «актыўнічаць» круглы год.

### ЧЫПСЫ ПАД ЗАБАРОНАЙ

— Жывёл мы кормім два разы на дзень, за выключэннем рэптылій. Яны харчуюцца раз на тыдзень. Драпежнікаў кормім рыбай, мясам. Напрыклад, тыгру ў дзень даюць каля 7 кілаграмаў мяса, прычым яно павінна быць нятлустае. Не дазваляем наведвальнікам карміць жывёлін, таму што кормяць звычайна тым, што ядуць самі. Чыпсы, папкорн даюць альбо булку. У жывёлін больш складаныя страўнікі. Самі адысці ад людзей яны не могуць, а потым пачынаюцца праблемы са здароўем.

Цяжка жывёліне прыстасавацца да нізкай тэмпературы. Але браты нашы меншыя не дэпрэсуюць, а абжываюць свае «зімовыя кватэры», падрыхтаваныя спецыялістамі заапарка.

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
veronika.ulasevich@mail.ru

**Дарагія сябры!**
**Прыміце самыя шчырыя віншаванні з навагоднімі святамі!**

*Спадзяемся, што 2017-ы стане ўдалай падставай для тых, хто хоча нешта змяніць у сваім жыцці ці пачаць спачатку, што ён будзе плённым для ўсіх, хто цвёрда стаіць на нагах і робіць добрыя справы!*

*Верым, што здзейсніцца ўсё, што задумалі, што ў гісторыю нашага жыцця гэты год увойдзе багатым на прыемныя падзеі і знаёмствы, на радасныя сустрэчы і новыя адкрыцці!*

*Шчыра зычым, каб заўжды побач з вамі былі вашы блізкія, каб здароўе ва ўсіх было моцным, праца — любімай, заробак — варты, сябры – надзейнымі, а шчасце – неабдымным!*

**Калектыў ААТ «БПЗ»**

http://www.protein.by/

Белыничский протеиновый завод

З Новым годам!

УНП 700003086

# КВЕТКА НА ХВАЛЯХ АКІЯНА

## ЧАМУ НЕСПАКОЙНА НА МАЛЬДЫВАХ?



**Урад Мальдыўскай Рэспублікі абвясціў аб выхадзе з Садружнасці Нацый. Як сцвярджаецца ў заяве Міністэрства замежных спраў дзяржавы, «рашэнне было цяжкім, але непазбежным». «На жаль, Садружнасць не прызнала прагрэс і дасягненні Мальдываў у сферы фарміравання культуры дэмакратыі ў краіне і ў будаўніцтве і ўмацаванні дэмакратычных інстытутаў», — адзначылі ў знешнепалітычным ведамстве. Як вядома, Садружнасць Нацый, раней Брытанская Садружнасць, — добраахвотнае міждзяржаўнае аб'яднанне 52 суверэнных дзяржаў, у якое ўваходзяць Вялікабрытанія і многія яе былыя дамініёны, калоніі і пратэктараты, а таксама Мазамбік, Руанда, Намібія і Камерун. За ўвесь час існавання глабальнага альянсу з яго выходзілі Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Фіджы, Пакістан, Зімбабвэ, Гамбія. Выхад Мальдываў стаў для ўсіх нечаканасцю — яшчэ нядаўна дзяржава рабіла ўсё, каб у Садружнасці застацца. Чаму тут змянілі сваю пазіцыю і што гэта азначае для астраўной краіны і ўсіх астатніх гульцоў на прасторах Індыйскага акіяна?**

### Скрыня Пандоры

Апошнія паўтара года Брытанская Садружнасць адчайна спрабавала прымусіць Мальдывы змяніць сваю ўнутраную палітыку, абвінавачваючы дзеючага прэзідэнта Абдулу Яміна ў парушэнні дэмакратычных стандартаў і пераследзе палітычных апанентаў, — у прыватнасці, былога прэзідэнта Мухамеда Нашыда, асуджанага да 13 гадоў турмы па абвінавачванні ў тэрарызме. Кожны раз прэзідэнт Ямін, дзякуючы ўмелым знешнепалітычным манеўрам, умудраўся пазбягаць санкцый, заручыцца падтрымкай то Індыі, то Пакістана, то Малайзіі. Нарэшце ў лютым міністэрская група дзеянняў Садружнасці выставіла Мальдывам ультыматум: да верасня Ямін павінен быў вызваліць усіх палітычных зняволеных і правесці судовую рэформу.



Ужо летам стала зразумела, што патрабаванні не будуць выкананы. Замест змякчэння ўнутранай палітыкі, Ямін, нягледзячы на пратэсты ААН, адмяніў 60-гадовы мараторый на смяротнае пакаранне. Калі ў верасні праваабаронцы канстатавалі, што патрабаванне Садружнасці не выканана, Абдула Ямін не стаў чакаць сакавіцкага пасяджэння міністэрскай групы, дзе, напэўна, было б прынята неспрыяльнае для Мале рашэнне, ігнаруючы апярэджанне і абвясціў аб выхадзе з арганізацыі. У афіцыйным тлумачэнні МЗС Мальдываў заявіла, што ўсе абвінавачванні ў парушэнні дэмакратычных стандартаў не маюць пад сабой падстаў, і папракнула Садружнасць ва ўмяшанні ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы.

Хто ж мае рацыю і навошта Яміну спатрэбілася ўводзіць смяротнае пакаранне? Большасць ведаюць аб Мальдывах толькі тое, што гэта раскошны курорт, месца, якое яшчэ вядомы падарожнік Марка Пола назваў «кветкай Індыйскага акіяна». Але на райскіх астравах (увогуле, гэта ланцуг з 20 атолаў, які складаецца з 1192 каралавых астраўкоў) апошнія дзесяцігоддзі кіпелі нежартоўныя жарсці. За паўстагоддзя незалежнасці былы султанат перажыў, напрыклад, высылку прэм'ера на далёкі атол, уцёкі другога прэм'ера з усёй казной у Сінгапур і спробу перавароту з удзелам наймітаў-тамілаў.

З 1978 па 2008 гады рэспублікай жалезнай рукой кіраваў Мамун Абдул Гаюм. Пяць разоў яго выбіралі прэзідэнтам — адзіны кандыдат, ён нязменна атрымліваў больш за 90 працэнтаў галасоў. Ён перажыў адзін замах і тры спробы перавароту, але ў рэшце рэшт, састурпіўшы патрабаванням апазіцыі і ціску з-за мяжы, пагадзіўся на альтэрнатыўныя выбары. Хоць Гаюм стварыў для сябе максімальна выгадныя ўмовы, ён прайграў. Да ўлады прыйшоў кандыдат ад апазіцыі Мухамед Нашыд, па-еўрапейску адукаваны ліберал, які меў за плячыма 16 турэмных тэрмінаў і добрыя сувязі з брытанскім істэблішментам. Ён паабяцаў справіцца з інфляцыяй, беспрацоўем, карупцыяй і наркагандлем. Аднак рэформы забуксавалі. Нашыд абвінавачваў у гэтым прыхільнікаў старога рэжыму, што акапаліся на ключавых пасадах. Апазіцыя ў адказ заяўляла, што прэзідэнт хоча знішчыць іслам і ператварыць Мальдывы ў заходнюю марыянетку.

У народзе спела глухая незадаволенасць. Непрадуманыя дзеянні Нашыда, які загадаў насуперак закону ў студзені 2012 года арыштаваць найвышэйшага суддзю, выклікалі масавыя пратэсты. Паліцыя адмовілася ўжываць сілу супраць дэманстрантаў і далучылася да іх. Мухамед Нашыд падаў у адстаўку — як ён пазней тлумачыў, «пад дулам пісталета». На выбарах, якія адбыліся неўзабаве, перамогу атрымаў зводны брат Гаюма — Абдула Ямін.

Спрабуючы заручыцца падтрымкай кансерватараў і максімальна дыстанцыявацца ад зрынутага Нашыда, Ямін абвясціў іслам змацаваннем нацыі, якое ратуе астравы ад спроб заходніх краін падарваць іх суверэнітэт. Хоць большасць мальдыўцаў — мусульмане-суніты, іслам на Мальдывах заўсёды быў асаблівым, з дамешкай мясцовых звычаяў. Абдула Ямін зрабіў стаўку на Саудаўскую Аравію, і на астравы накіраваліся прапаведнікі-салафіты са сваімі ідэямі «чыстага ісламу», а Эр-Рыяд выдзяліў грошы на будаўніцтва ў сталіцы краіны Мале новага ісламскага ўніверсітэта. Як лічаць эксперты, такім чынам Ямін насамрэч адкрыў «скрыню Пандоры».

### Жорсткай рукой

Баевікі-мальдыўцы апублікавалі відэа з пагрозамі забіць прэзідэнта і зладзіць тэракты на курортах, калі Мале не ўвядзе ў краіне законы шарыяту і не вызваліць кіраўніка мясцовага адгалінавання «Братоў-мусульман» — партыі «Адхалат» — шэйха Імра Абдула, асуджанага за тэрарызм да 12 гадоў турмы. Тэракты на курортах былі б для Мальдываў катастрофай. Па розных ацэнках, ад 60 да 90 працэнтаў усёй валюты краіна зарабляе на курортніках, 70 працэнтаў эканомікі так ці інакш завязаны на турыстычны сектар. Удар па ім запусціць эфект даміно, абрынуўшы эканоміку. Мальдывы імпартуюць прадукты харчавання, ваду і паліва, і найменшыя перабоі з імі выклічуць масавы ўсплёск незадаволенасці, які проста змяце рэжым.

Да ўсяго іншага, актыўную дзейнасць разгарнула апазіцыя: былы прэзідэнт Нашыд, які атрымаў прытулак у Лондане, праведў у жніўні гэтага года сустрэчу апазіцыянераў на Шры-Ланцы. Была створана Мальдыўская аб'яднаная апазіцыя, якая аб'явіла сваёй мэтай звяржэнне прэзідэнта. У шэрагах «Прагрэсіўнай партыі», якая ў свой час вылучыла Яміна на пасаду прэзідэнта, разлад і закісанне: не старшыня, былы лідар краіны Гаюм, дамовіўся аб саюзе з Нашыдам супраць уласнага зводнага брата. Ямін не можа абаперціся нават на найбліжэйшых паплечнікаў: год таму па абвінавачанні ў падрыхтоўцы замаху на прэзідэнта быў арыштаваны і віцэ-прэзідэнт Ахмед Адзіб, цяпер ён адбывае трыццацігадовы тэрмін за кратамі.

У гэтай сітуацыі жорсткія меры заклікаваны ўмацаваць аўтарытэт прэзідэнта: як паказваюць апытанні, пераважная большасць мальдыўцаў падтрымліваюць увядзенне смяротнага пакарання, да таго ж першыя два прысуды вынесены наркаманам-забойцам, якія расправіліся са сваімі ахвярамі з асаблівай жорсткасцю. Ідучы на канфрантацыю з Садружнасцю і замежнымі дзяржавамі, сцвярджаючы прыярытэт ісламскіх традыцый над заходнім гуманізмам, Ямін спадзяецца заручыцца падтрымкай кансерватараў і адначасова дэманструе празаходняй і ісламісцкай апазіцыі гатоўнасць звярнуцца да крайніх мераў.

### Паміж Нью-Дэлі і Пекінам

Традыцыйны патрон Мале, Нью-Дэлі, аказаўся ў складанай сітуацыі. З самага пачатку незалежнасці Мальдывы ўваходзілі ў сферу ўплыву Індыі. Менавіта індыйскія войскі прыйшлі на дапамогу прэзідэнту Гаюму ў 1988 годзе, прадухіліўшы пераварот з удзелам наймітаў — паўтары тысячы дэсантнікаў, якія высадзіліся на астравах, не пакінулі мяцежнікам нават найменшага шанцу. Індыйскія самалёты першымі даставілі дапамогу Мальдывам пасля цунамі 2004 года. З 2009-га на астравах разгорнута сетка радараў і станцыя марской разведкі ВМС Індыі. Нарэшце, гэтая краіна — асноўны гандлёвы партнёр Мальдываў.

Запэўніваючы Індыю ў вечнай дружбе, прэзідэнт Ямін адначасова ўмацоўвае сувязі з Кітаем. Пекін аказвае Мале грашовую дапамогу, накіроўваючы туды інвестыцыі і дапамагаючы ў развіцці інфраструктурных праектаў. Хадзілі нават чуткі, што Мальдывы гатовыя здаць кітайцам у арэнду адзін з астравоў для стварэння базы. Старшыня КНР Сі Цзіньпін наведаў Мальдывы восенню 2014 года ў ходзе паўднёваазіяцкага турнэ. Гэты візіт не быў выпадковым: у кітайскіх планах Мальдывам адводзіцца важная роля — гэта пункт на «Марскім Шаўковым шляху XXI стагоддзя», гандлёвым маршруце з Кітая ў Еўропу праз Індыйскі акіян. У адрозненне ад многіх іншых дзяржаў, КНР дэманстратыўна не ўмешваецца ва ўнутраныя справы Мальдываў. Як растлумачыў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Хун Лэй, «Пекін мяркуе, што мальдыўскі бок здолее сам справіцца са сваімі ўнутранымі праблемамі».

Пра тое, што Ямін не гатовы ахвяраваць сяброўствам з Кітаем дзеля свайго «старэйшага індыйскага брата», сведчыць гісторыя з аэрапортам імя Ібрагіма Насіра. У 2010 годзе, пры прэзідэнце Нашыдзе, кантракт на яго мадэрнізацыю атрымала індыйская кампанія. У 2014-м прэзідэнт Ямін абвясціў аб скасаванні дагавора, патлумачыўшы, што ён быў заключаны Нашыдам з парушэннем правілаў. Кантракт коштам 800 мільёнаў долараў перадалі кітайскай фірме, што выклікала абурэнне індыйцаў.

Выхад Мальдываў з Садружнасці выгадны Кітаю: Мале, не звязаны больш хартыяй арганізацыі, зможа больш актыўна супрацоўнічаць з Пекінам. У свой час так паступілі на Фіджы.

Далейшае развіццё падзей залежыць ад двух узаемазвязаных фактараў: ці ўдасца Абдуле Яміну ўтрымаць уладу і як будзе паводзіць сябе Нью-Дэлі. Індыі трэба будзе зрабіць нялёгкі выбар: індыйскіх сілавікоў даўно турбуе пранікненне ісламістаў і баевікоў арганізацыі «Лашкар-э-Таіба», якая базуецца ў Пакістане, на Мальдывы, а таксама ўплыў Кітая, які ўзмацняецца.

Яшчэ ў кастрычніку 2015 года звергнуты прэзідэнт Нашыд заклікаў Нарэндру Модзі ўмяшацца ў сітуацыю і дапамагчы вывесці Мальдывы з крызісу. Тады індыйскі прэм'ер не адказаў на заклік. Цяпер, у момант абвастрэння адносін паміж Індыяй і Пакістанам, мальдыўская апазіцыя адкрыта падтрымала Нью-Дэлі, а прэзідэнт Ямін па-ранейшаму захоўвае маўчанне, якое можа яму дорага абысціся.

### Глеба для радыкалаў

Амаль палова насельніцтва Мальдываў (больш за 150 тысяч чалавек з 400 тысяч) жывуць у сталіцы краіны. У Мале высокі ўзровень беспрацоўя сярод моладзі, квітнеюць злачыннасць і наркагандаль. Умовы, у якіх адпачываюць турысты ў раскошных доміках на аддаленых астравах, вельмі далёкія ад паўсядзённага жыцця ў сталіцы дзяржавы. Так, многія жыхары Мале туляцца ў маленечкіх шматкватэрных дамах і вымушаны ў прамым сэнсе спаць пазменна. У глыбінцы сітуацыя не лепшая: хоць Мальдывы лічацца турыстычным раем, кіруюць гатэлямі ў асноўным еўрапейцы і аўстралійцы, а персанал набіраецца ў бангладэшцаў.

Беспрацоўная моладзь, якая штодня назірае багатых турыстаў, — выдатны матэрыял для радыкалізацыі. Паводле афіцыйных даных, першыя мальдыўцы, якія прагнуць джыхаду ў імя чыстага ісламу, адправіліся ў Ірак яшчэ ў 2013 годзе. Туды едуць і сталічная моладзь, і бедныя рыбакі з аддаленых астравоў. Большасць джыхадыстаў далучаюцца альбо да «Джабхат ан-Нусрэ», альбо да «Ісламскай дзяржавы». Усяго, па падліках мясцовага МУС, у шэрагі баевікоў улілося больш за 200 грамадзян краіны — такім чынам, Мальдывы выбіліся ў сусветныя лідары па колькасці ісламістаў на душу насельніцтва.

Па словах выканаўчага дырэктара аднаго з аналітычных цэнтраў у Нью-Дэлі Амінеша Роўлі, хоць улады краіны і не знаходзяцца пад прамым уплывам пэўнага мулы, у Мале схільныя ігнараваць рост ісламізацыі грамадства і палітыкі. Як мяркуюць эксперты, ёсць усе перадумовы для таго, што надалей адбудзецца скарачэнне прасторы для плюралізму, а таксама ўзважанага палітычнага абмеркавання. З-за складанай эканамічнай сітуацыі ісламізм можа проста паглынуць Мальдывы. Краіна, вядомая сваімі курортамі, усё больш становіцца ўрадлівай глебай для радыкальных ісламістаў. А гэта вельмі небяспечна.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*





## Паритетбанк




УТВЕРЖДЕНО
Решением
Наблюдательного Совета
ОАО «Паритетбанк»
от 14.12.2016 №18

### ИЗМЕНЕНИЯ № 2 В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ облигаций десятого, одиннадцатого, двенадцатого выпусков ОАО «Паритетбанк»

1. Абзац первый пункта 1.6 изложить в следующей редакции:

**«1.6. Размер уставного фонда эмитента:**

Уставный фонд Банка составляет 660 988 969 200 (Шестьсот шестьдесят миллиардов девятьсот восемьдесят восемь миллионов девятьсот шестьдесят девять тысяч двести) белорусских рублей.».*

2. Пункт 2.2. Раздела 2. Сведения о проведении открытой продажи облигаций в отношении 11-го выпуска изложить в следующей редакции:

| № выпуска | 11 |
|---|---|
| **Валюта займа** | Белорусский рубль (в денежных знаках образца 2009 года (после деноминации)) |
| **Форма выпуска облигаций** | Именные, процентные, неконвертируемые, бездокументарные (в виде записей на счетах) |
| **Объем эмиссии** | 5 000 000 (Пять миллионов) |
| **Количество облигаций** | 50 000 (Пятьдесят тысяч) |
| **Серия, номера облигаций** | серия «ПБ-11», номера 000001-050000 |
| **Номинальная стоимость** | 100 (Сто) |




Председатель Правления А.С.Бриштелев

Главный бухгалтер И.Б.Сафронова

* Здесь и далее, за исключением пункта 2.2. Раздела 2, данные, выраженные в денежных единицах, указаны в денежных знаках образца 2000 года (до деноминации).

---

### ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве СООО «РЭКУН ПЛАСТИК», извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 27 января 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 2.**

Для участия в торгах необходимо подать **до 25 января 2017 года** заявку и перечислить на расчетный счет СООО «РЭКУН ПЛАСТИК» р/с 3012162872017 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 702, г. Минск, код 369, УНП 800000106 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.

*Сведения об имуществе, выставляемом на торги*

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Экструзионное оборудование и запасные части к нему | 12 123,30 | 606,17 |
| 2 | Оснастка для экструзионного оборудования | 8 157,20 | 407,86 |
| 3 | Вспомогательное оборудование для использования в производстве | 7 630,10 | 381,51 |
| 4 | Иные агрегаты и вспомогательное оборудование для производства | 14 472,50 | 723,63 |
| 5 | Товары для офиса (основные средства) | 2 501,70 | 125,09 |
| 6 | Офисные принадлежности | 1 039,30 | 51,97 |
| 7 | Оборудование, комплектующие и иные вспомогательные ТМЦ различного назначения | 7 280,60 | 364,03 |
| 8 | Отходы от производства пластика | 4 935,29 | 246,76 |
| 9 | Шпунт SP PVC 200 и SP PVC 600 | 24 955,00 | 1247,75 |
| 10 | Инструменты различного назначения | 2 833,84 | 141,69 |

***Подробную информацию об имуществе СООО «РЭКУН ПЛАСТИК», входящего в состав каждого лота, можно получить на сайте http://bankrot.gov.by.***

Также с имуществом, выставляемым на торги, можно ознакомиться по месту его нахождения, предварительно согласовав время с управляющим по тел. +375293421842.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 2.

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел. +37529 342 18 42.

---

### Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 412/С-23409 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание сепараторного отделения), площадью 242,3 кв.м м.п., расположенное по адресу: Мостовский р-н, а.г. Лунно, ул. Гродненская, 8 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424082706601000553 (назначение – для обслуживания производственного участка сепараторного отделения), площадью 0,1386, расположенного по адресу: Мостовский р-н, а.г. Лунно, ул. Гродненская, 8 |
| **Начальная цена продажи** | 30 360,78 (тридцать тысяч триста шестьдесят рублей семьдесят восемь копеек) |
| **Сумма задатка** | 3036 р. (три тысячи тридцать шесть рублей) |
| **Продавец** | ОАО «Щучинский маслосырзавод», 231513, г. Щучин, ул. 17 Сентября, 45, 8-01514-270-82 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
